Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

62 (7388)
ПЯТНІЦА
6
красавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

ЗАГАД
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
Камандуючаму войскамі 2-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза МАЛІНОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта генерал-палкоўніку ЗАХАРАВУ

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, сёння, 5 красавіка, авалодалі гарадамі і важнымі чыгуначнымі вузламі МАЛАЦКІ і БРУК, адначасова войскі фронта з боем занялі гарады ПРЭВІДЗА і БАНОЎЦЭ — моцныя апорныя пункты абароны немцаў у паласе Карпат.

У баях за авалоданне гарадамі МАЛАЦКІ, БРУК, ПРЭВІДЗА, БАНОЎЦЭ вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ШУМІЛАВА, генерал-лейтэнанта ПЕТРУШЭЎСКАГА, генерал-лейтэнанта ЖМАЧЭНКА, генерал-лейтэнанта МАНАГАРАВА, 1-й Румынскай арміі корпуснага генерала АЦЯНАСІУ, генерал-маёра ЛУКІНА, генерал-маёра БІРМАНА, генерал-маёра ЯКАЎЛЕВА, палкоўніка ПІГІНА, генерал-маёра АЛЁХІНА, генерал-маёра КРУЗЕ, генерал-лейтэнанта РУБАНЮКА, генерал-маёра АФОНІНА, генерал-маёра ШКАДУНОВІЧА, генерал-маёра РУМЯНЦЭВА, генерал-маёра МАЛАЖАЕВА, генерал-маёра КАРПУХІНА, генерал-маёра СМІРНОВА, генерал-маёра ЛОСЕВА, генерал-маёра МАРГЕЛАВА, генерал-маёра САКАЛОЎСКАГА, генерал-маёра МІЛЯЕВА, генерал-маёра УМАНСКАГА, палкоўніка МАРОЛЬ, палкоўніка ОРЛОВА, палкоўніка ГУШЧЫНА, палкоўніка БАЛДЫНАВА, палкоўніка КОЎТУН-СТАНКЕВІЧА, палкоўніка ЦАЛАЙ, палкоўніка САЖЫНА, палкоўніка КАРНАЧОВА; кавалерысты генерал-лейтэнанта ПЛІЕВА, генерал-маёра ПІЧУГІНА, генерал-лейтэнанта СОКАЛАВА, генерал-маёра ПАЎЛАВА, генерал-маёра БЕЛАУСАВА, генерал-маёра ХРУСТАЛЁВА; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі ФАМІНА, генерал-лейтэнанта артылерыі ДЗЕРЫША, генерал-лейтэнанта артылерыі ПЕТРОВА, генерал-маёра артылерыі КАРЭЦКАГА, генерал-маёра артылерыі АЛЕКСЕЕНКА, генерал-маёра артылерыі ПАЎЛАВА, генерал-маёра артылерыі ІВАНОВА, генерал-маёра артылерыі ЗЫКАВА, генерал-маёра артылерыі ПАПОВІЧА, палкоўніка МАРЧАНКА, палкоўніка БАРЫСАВА, падпалкоўніка КЛІМАНАВА, падпалкоўніка СІДЗЕЛЬНІКАВА, падпалкоўніка СМІРКОВА, падпалкоўніка ЛІТВІНЕНКА, падпалкоўніка ГУБЕНКА, падпалкоўніка ЯРГІНА, падпалкоўніка ГЛУШЧЭНКА, маёра БАРХАТАВА, маёра ШВЕЦАВА, маёра УСЦІНАВА, маёра ШЧЭРБІНА; танкісты генерал-палкоўніка танкавых войск КУРКІНА, генерал-лейтэнанта СВІРЫДАВА, генерал-маёра танкавых войск БАГДАНАВА, палкоўніка СУПЯНА, палкоўніка РУМЯНЦЭВА, палкоўніка ЛЯШЧЭНКА, палкоўніка МАЛЫШЭВА, палкоўніка ОГНЕВА, падпалкоўніка АНТОНАВА, падпалкоўніка ЧЫЧЭВА, падпалкоўніка КІРЫЛАВА, падпалкоўніка ЧЭРНЕНКА, падпалкоўніка ШАЛК, падпалкоўніка МАРОЗА, маёра СЕМЕНЕЦ, маёра СЕЎРУКОВА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі ГАРУНОВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі СЕЛЕЗНЁВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ПАДГОРНАГА, генерал-лейтэнанта авіяцыі СЦЕПІЧЭВА, генерал-маёра авіяцыі КАМАНІНА, палкоўніка ТАРАНЕНКА, палкоўніка ЮДАКОВА, палкоўніка ГЕЙБО, палкоўніка ШУЦЕЕВА, палкоўніка ЧЫЖЫКАВА, палкоўніка БЛАГАВЕШЧАНСКАГА, палкоўніка КАМАРОВА, палкоўніка САПРЫКІНА, палкоўніка КЛАБУКОВА, палкоўніка СЕМЕНЕНКА, палкоўніка румынскай арміі БУРДУЛОЮ; сапёры генерал-лейтэнанта інжынерных войск ЦЫРЛІНА, генерал-маёра інжынерных войск ПЛЯСКІНА, генерал-маёра інжынерных войск ПЕТРОВА, генерал-маёра інжынерных войск ТУПІЧЭВА, палкоўніка ЗІМІНА, палкоўніка МЯСНІКОВА, палкоўніка ЦЭПЕНЮКА, палкоўніка КАЛІНІЧЭНКА, палкоўніка БУДАРЫНА, палкоўніка ІСАЕВА, падпалкоўніка БАДАЕВА, маёра ФАМЕНКА; сувязісты генерал-лейтэнанта войск сувязі ЛЕОНАВА, палкоўніка БАРЫСЕНКА, палкоўніка ЕГОРАВА, палкоўніка ГАРЭЛКІНА, палкоўніка МАКАРЭНКА, палкоўніка ДАВЫДАВА, маёра ШЫШЭЛАВА, палкоўніка дзяржаўнай бяспекі КАРПАВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне гарадамі МАЛАЦКІ, БРУК, ПРЭВІДЗА, БАНОЎЦЭ, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 5 красавіка, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га Украінскага фронта, у тым ліку 1-й румынскай арміі корпуснага генерала АЦЯНАСІУ, якія авалодалі названымі гарадамі, — дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне МАЛАЦКІ, БРУК, ПРЭВІДЗА, БАНОЎЦЭ.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

5 красавіка 1945 года
№ 331

ЗАГАД
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
Камандуючаму войскамі 4-га Украінскага фронта
Генералу арміі ЕРОМЕНКА
Начальніку штаба фронта генерал-палкоўніку САНДАЛАВУ

Войскі 4-га УКРАІНСКАГА фронта, сёння, 5 красавіка, авалодалі горадам РУЖАМБЕРОК — важным вузлом дарог і апорным пунктам абароны немцаў на рацэ ВАГ у Чэхаславакіі.

У баях за авалоданне горадам РУЖАМБЕРОК вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта ГАСЦІЛОВІЧА, чэхаславацкага корпуса генерала брыгады СВАБОДА, генерал-маёра БРЫЛЁВА, генерал-лейтэнанта МЕДЗВЕДЗЕВА, генерал-маёра ПРОХАРАВА, палкоўніка УГРУМАВА, палкоўніка ВАСІЛЬЕВА, генерала брыгады БОЧЭК, палкоўніка ВІНАГРАДАВА, генерала брыгады САТОРЭ, палкоўніка БРОЖ, палкоўніка СЕЛНЕР; артылерысты генерал-маёра артылерыі ІВАНОВА, палкоўніка ЯКАЎЛЕВА, палкоўніка МІРОНАВА, палкоўніка ТЕРОХІНА, палкоўніка БОЧЭК, маёра КУЗЬМІНА, маёра АКЦЮРЫНА, маёра КУЛЯШОВА; танкісты палкоўніка СЕРОВА, маёра СНЕТКОВА; сапёры палкоўніка ЖУРЫНА, палкоўніка КЛЮЧНІКАВА, падпалкоўніка ПАПОВА, маёра КАВАРЖЭК; сувязісты палкоўніка НЕКРАСАВА, падпалкоўніка СМІРНОВА, маёра НОСІКАВА, капітана АРТАМОНАВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне горадам РУЖАМБЕРОК, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 5 красавіка, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 4-га Украінскага фронта, у тым ліку чэхаславацкаму корпусу генерала брыгады СВАБОДА, якія авалодалі горадам РУЖАМБЕРОК, — дванаццаццю артылерыйскімі залпамі з ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне горада РУЖАМБЕРОК.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

5 красавіка 1945 года
№ 332

АБ ДЭНАНСАЦЫІ СОВЕЦКА-ЯПОНСКАГА ПАКТА АБ НЕЙТРАЛІТЭЦЕ

5 красавіка ў 3 гадзіны дня Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў прыняў японскага Пасла пана Н. Сато і ад імені Совецкага Урада зрабіў яму наступную заяву:

«Пакт аб нейтралітэце паміж Совецкім Саюзам і Японіяй быў заключан 13 красавіка 1941 года, г. зн. да нападу Германіі на СССР і да ўзнікнення вайны паміж Японіяй, з аднаго боку, і Англіяй і Злучанымі Штатамі Амерыкі, з другога.

З таго часу абстаноўка змянілася ў корані. Германія напала на СССР, а Японія, саюзніца Германіі, дапамагае апошняй у яе вайне супроць СССР. Апрача таго, Японія вае з ЗША і Англіяй, якія з'яўляюцца саюзнікамі Совецкага Саюза.

Пры такім становішчы Пакт аб нейтралітэце паміж Японіяй і СССР страціў сэнс, і прадоўжанне гэтага Пакта стала немагчымым.

У сілу сказанага вышэй і ў адпаведнасці з артыкулам 3-м памянёнага Пакта, які прадугледжвае права дэнансацыі за адзін год да сканчэння пяцігадовага тэрміну дзеяння Пакта, Совецкі Урад гэтым заяўляе Ураду Японіі аб сваім жаданні дэнансіраваць Пакт ад 13 красавіка 1941 года».

Пасол Японіі п. Н. Сато абяцаў давесці да ведама японскага Урада заяву Совецкага Урада.

ПРЫБЫЦЦЁ Ў МАСКВУ СТАРШЫНІ СОВЕТА МІНІСТРАЎ ЮГАСЛАВІІ МАРШАЛА ТІТО І МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ПАНА ШУБАШЫЧА

5 красавіка ў Маскву прыбыў Старшыня Совета Міністраў Югаславіі Маршал Іосіп Броз-Тіто ў суправаджэнні Міністра Замежных Спраў Югаславіі пана І. Шубашыча, Міністра па Справах Чорнагорыі генерал-лейтэнанта М. Джыласа, Міністра Гандлю і Снабжэння пана Н. Петровіча, Міністра Горнай Прамысловасці пана Б. Андрэева, Начальніка Югаслаўскай Ваеннай Місіі ў СССР генерал-лейтэнанта Р. Прыморац.

Разам з Маршалам І. Броз-Тіто прыбылі Совецкі Пасол у Югаславіі І. В. Садчыкаў і Начальнік Совецкай Ваеннай Місіі ў Югаславіі генерал-маёр А. Ф. Кісялёў.

На Цэнтральным аэрадроме Маршала І. Броз-Тіто і суправаджаючых яго асоб сустракалі Намеснік Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў, Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў СССР А. Я. Вышынскі, Начальнік Генеральнага Штаба Чырвонай Арміі генерал арміі А. І. Антонаў, генерал-палкоўнік Ф. І. Голікаў, Намеснік Старшыні Маскоўскага Гарадскога Совета М. А. Ясноў, Загадчык 4-га Еўрапейскага Аддзела НКЗС СССР А. А. Лаўрышчэў, Камендант г. Масквы генерал-лейтэнант К. Р. Сінілаў, генерал-лейтэнант А. С. Гундораў, Намеснік Загадчыка Пратакольнага Аддзела НКЗС СССР Г. І. Фамін і др.

На аэрадроме прысутнічаў дыпламатычны корпус.

Пры сустрэчы быў выстраен пачотны караул і былі выкананы дзяржаўныя гімны Югаславіі і Совецкага Саюза. Аэрадром быў упрыгожан югаслаўскімі і совецкімі флагамі.

Заява Маршала Тіто

Маршал Тіто, які прыбыў учора, 5 красавіка, у Маскву, зрабіў перад мікрафонам на аэрадроме наступную заяву:

«Адчуваю вялікую радасць, што магу сёння тут, у вялікай сталіцы вялікага Совецкага Саюза, перадаць гарачае прывітанне і глыбокую падзяку Совецкаму Саюзу за тую велізарную маральную і матэрыяльную дапамогу, якую ён даў і дае народам Югаславіі ў іх цяжкай барацьбе супроць германскага акупанта і яго квіслінгаў. Але надышоў час, калі і наша радзіма—Югаславія хутка будзе поўнасцю ачышчана ад германскай нечысці і перамога блізка. Гэта справа толькі некалькіх дзён, не больш месяца.

Няхай жыве вялікі Совецкі Саюз!

Няхай жыве вялікая непераможная Чырвоная Армія і яе геніяльны правадыр пан Маршал Совецкага Саюза Сталін!

Смерць фашызму, свабода народу!»

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА УРАДЖАЙ!

Рэспубліка напярэдадні масавых палявых работ. У радзе раёнаў Палесся і Гомельшчыны пачалі ворыва. На Піншчыне пасеяны першыя тысячы гектараў ранніх збожжавых культур. Па меры прасыхання глебы пачынаюць сеяць і ў другіх паўднёвых раёнах.

Веснавая сяўба—важнейшы этап сельскагаспадарчых работ. Вясною закладаецца фундамент будучага ўраджаю, з вясны пачынаецца напружаная барацьба за ўраджай непасрэдна ў полі, у баразне. І нездарма народная мудрасць гаворыць: «Што пасееш вясной, тое знойдзеш зімой».

Ці ўсё ў нас падрыхтавана для масавага разгортвання палявых работ? Ці закончана ачыстка насення і рамонт інвентару, ці хопіць вывезенага ў поле навозу, каб забяспечыць ураджай паводле намечанага плана? Ці падрыхтаваны да сяўбы коні і ці прывучаны да ворыва і баранавання малапрадуктыўныя каровы?

У калгасах, соўгасах і МТС рэспублікі яшчэ да вайны ўстанавілася традыцыя кожную вясну праводзіць агляд гатоўнасці да сяўбы. Агляд—гэта не проста рэгістрацыя таго, што выяўлена ў калгасе, соўгасе, МТС. Праверка і агляд — гэта дзейсная дапамога, накіраваная на тое, каб хутчэй дабіцца завяршэння падрыхтоўкі да сяўбы ў кожным калгасе, соўгасе і МТС рэспублікі. Праверка гатоўнасці да сяўбы, якая цяпер праводзіцца, паказала, што партыйныя, совецкія арганізацыі і земельныя работнікі многіх раёнаў і абласцей нашай рэспублікі правялі сур'ёзную работу, рыхтуючы вясне дастойную сустрэчу. І адначасова праверка выявіла нямала слабых месц і недахопаў у падрыхтоўцы да сяўбы.

У некаторых калгасах Магілёўшчыны яшчэ і да гэтага часу валяюцца па загуменнях сотні неадрамантаваных плугоў, боран і іншага інвентару. У калгасах Палесся, дзе пачаліся палявыя работы, ляжаць яшчэ неачышчаныя сотні пудоў насення яравых культур. Сяўба надышла, а ва Уздзенскім, Заслаўскім, Чэрвеньскім і Лагойскім раёнах толькі цяпер ставяць пытанне пра арганізацыю перасовачных збожжаачышчальных абозаў.

Добрушская, Жлобінская і Будзішчанская МТС, Гомельскай вобласці, запаргнулі рамонт і аднаўленне трактараў. У Дзержынскай МТС, Мінскай вобласці, дзе дырэктарам тав. Цімошак, прабавалі выдаць за адрамантаваны трактар, які меў 28 недаробленых «дробязей». Ні адзін з дырэктараў трох МТС Барысаўскага раёна не забяспечыў свае газагенератары такім танным мясцовым палівам, як чуркі. Гэта нецярпімая з'ява.

Павышэнне працоўнай дысцыпліны і далейшае ўмацаванне брыгад і звенняў—важнейшыя ўмовы паспяховага правядзення веснавой сяўбы. А між тым у радзе калгасаў яшчэ і да гэтага часу брыгадзіры спрачаюцца за інвентар і цяглавую сілу, а многія звенні існуюць толькі на паперы.

Пачынаецца складаны комплекс сельскагаспадарчых работ. І там, дзе ўжо з першага дня выхаду на палявыя работы па-сапраўднаму арганізоўваюць працу ў брыгадах і звенях, там накопіцца багаты вопыт, вырастуць новыя майстры соцыялістычнага земляробства, якія сваю стахаванўскую працу памножаць пасля на палях уборкі.

Велізарнае значэнне набывае вытворчы і рабочы план. Вытворчы план калгаса, складзены на аснове дзяржаўнага плана з улікам усіх прыродных і эканамічных умоў раёна, павінен намеціць шляхі ўсебаковага развіцця калгаснай гаспадаркі, скарыстання ўнутраных рэсурсаў і магчымасцей. Ён павінен стаць баявой праграмай штодзённай работы калгаснікаў па аднаўленню і развіццю ўсіх галін сельскай гаспадаркі: паляводства, жывёлагадоўлі, садоўніцтва, гародніцтва, пчалярства, рыбацтва.

Сяўба надыходзіць, і пакуль зярно не апушчана ў зямлю, трэба пакамапаціцца аб тым, каб усе культуры правільна размясціць у палях аднаўляемых севазваротаў, каб глебе былі вернуты яе жыццёвыя сілы.

Своечасовы выхад на палявыя работы дапаможа зберагчы каштоўную вільгаць у глебе і будзе спрыяць уздыму ўраджайнасці. Вясною кожны дзень дораг. А таму, не чакаючы падсыхання ўсёй глебы, трэба пачынаць палявыя работы выбарачна, па ўзгоркавых, пясчаных больш лёгкіх землях.

Палявыя работы разгортваюцца. І няма сумнення ў тым, што разгортваючы ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва, калгасная вёска і ўсё працоўнае сялянства Совецкай Беларусі адкажа на заклік кубанскіх калгаснікаў стаханаўскай працай на палях, яшчэ больш актыўнай барацьбой за высокі ўраджай 1945 года.

«Надыходзіць вясна,—пісалі нядаўна ў сваім пісьме ў «Правду» калгаснікі сельгасарцелі імені Варашылава, Церахоўскага раёна. —Хутка надыйдзе гарачая пасеўная пара. Выйдзем мы ў поле, выйдзем стары і малады на нашу родную зямлю і возьмемся за працу пястомную. І закіпіць на родных прасторах ад зары да зары праца спорная, праца дружная.

Зямля, палітая крывёю бацькоў і сыноў нашых, рукамі нашымі будзе любоўна дагледжана, добра апрацавана. Пакладзем мы ў яе добрае насенне, вырасцім багаты ўраджай. І будзе гэты ўраджай нашым калгасным укладам у справу канчатковай перамогі над ворагам лютым, над недругам нашым—нямцам».

Гэта словы гарачых патрыётаў нашай Радзімы, калгаснікаў перадавой арцелі Церахоўскага раёна. Гулкім водгуллем панясуцца яны па ўсёй нашай рэспубліцы, заклікаючы калгаснае сялянства, нашы сёлы і вёскі на барацьбу за паспяховую сяўбу.

Учора ў «Звяздзе» быў надрукаван зварот трактарыстаў, камбайнераў, аграномаў і механікаў Лохвіцкай МТС, Палтаўскай вобласці, да ўсіх работнікаў машынна-трактарных станцый Совецкага Саюза аб разгортванні ўсесаюзнага соцыялістычнага спаборніцтва МТС за высокі ўраджай 1945 года, за ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы. Няма сумнення, што заклік калектыва работнікаў Лохвіцкай МТС знойдзе самы шырокі водгук ва ўсіх машынна-трактарных станцыях нашай рэспублікі.

Вышэй сцяг усесаюзнага соцыялістычнага спаборніцтва! Адкажам на новыя гістарычныя перамогі нашай роднай Чырвонай Арміі яшчэ больш актыўнай барацьбой за высокі сталінскі ўраджай—ураджай перамогі.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 5 КРАСАВІКА

На працягу 5 красавіка на поўначы ад Гдыні войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта завяршылі ліквідацыю рэштак групы нямецкіх войск, прыціснутых да ўзбярэжжа заліва ПУТЦЫГЕР ВІК, заняўшы пры гэтым населеныя пункты ОКСХЕФТ, ОБЛУШ, АЛЬТ-ОБЛУШ, ПАГОРШ, НОЙ-ОБЛУШ, БАБЫ-ДУЛ, КОСАКАУ, ПІРВОШЫН, БРУК, МЕХЛІНКЕН, РЭВА.

У раёне БРЭСЛАУ прадаўжаліся баі па знішчэнню акружанай групы нямецкіх войск.

Войскі 4-га УКРАІНСКАГА фронта 5 красавіка сумесна з чэхаславацкімі войскамі авалодалі горадам РУЖАМБЕРОК — важным вузлом дарог і апорным пунктам абароны немцаў на рацэ ВАГ у Чэхаславакіі, а таксама занялі горад ЖЫВЕЦ і больш 40 другіх населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты ЮШЧЫНА, НАВОЦЬ, ЛОМНА, КНЯЖА, ДОЛЬНЫ КУБІН, ЯСЕНОВА.

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, 5 красавіка авалодалі гарадамі і важнымі чыгуначнымі вузламі МАЛАЦКІ і БРУК, адначасова войскі фронта сумесна з румынскімі войскамі з боем занялі гарады ПРЭВІДЗА і БАНОЎЦЭ—моцныя апорныя пункты абароны немцаў у паласе Карпат, а таксама занялі больш 50 другіх населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты СКЛЕНЕ, БРЭЗАНЫ, БОЙНІЦЭ, КОШ, НОВАКІ, СКАЧАНЫ, ЗАВАДА, БІКСАРД, САЛОШНІЦА, ЗАГОР, СТУПАВА, ЛАМАЧ, ВІДРЫЦА, ПЕТРЖАЛКА, ВОЛЬФСТАЛЬ, ГАЙНБУРГ, РОРАУ і чыгуначныя станцыі СКЛЕНЕ, НОВАКІ, ЗЕМЛЯНСКЕ КАСТАЛАНЫ, САЛОШНІЦА, ЗАГОР, СТУПАВА, ЛАМАЧ. У баях за Браціславу 4 красавіка войскі фронта ўзялі ў палон больш 2.500 салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі палявых гармат — 150, мінамётаў — 65, кулямётаў — 361, паравозаў — 82, чыгуначных вагонаў—1.681, складаў з боепрыпасамі, узбраеннем і прадуктамі харчавання — 71.

На ВЕНСКІМ напрамку войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, пераадольваючы супраціўленне праціўніка, занялі населеныя пункты РАУХЕНВАРТ, УНТЭР ЛАА, ОБЕР ЛАА (4 кілометры на поўдні ад Вены), ЛАКСЕНБУРГ, ГУНТРАМСДОРФ, ГУМПОЛЬДСКІРХЕН, ХАХРОТЭРДОРФ, БРАЙТЭНФУРТ і перарэзалі аўтастраду ВЕНА — ЛІНЦ. Адначасова на паўднёвым захадзе ад возера БАЛАТОН войскі фронта, наступаючы сумесна з войскамі балгарскай арміі, занялі на тэрыторыі Югаславіі горад ДОЛЬНІ ЛЕНТАВА і больш 40 другіх населеных пунктаў, у тым ліку ГЕНТАРОЎЦЫ, МОСЦЬЕ, ПЕТЫШОЎЦЫ, ПОДТУРЭК, МАЛАЯ СУБОЦІЦА. У баях за 4 красавіка войскі фронта ўзялі ў палон звыш 6.500 салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 43, танкаў і самаходных гармат — 31, бронетранспарцёраў — 26, палявых гармат — 148, кулямётаў — 440, аўтамашын — 150, паравозаў — 42, чыгуначных вагонаў — 760, складаў з боепрыпасамі, узбраеннем і прадуктамі харчавання — 28.

На другіх участках фронта—істотных змен не было.

За 4 красавіка падбіта і знішчана 22 нямецкія танкі. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 15 самалётаў праціўніка.

* * *

Войскі 2-га Беларускага фронта ліквідавалі рэшткі трупы нямецкіх войск, прыціснутых да заліва Путцыгер Вік на поўначы ад горада Гдыні. У канцы сакавіка нямецкія дывізіі, разгромленыя ў баях за Гдыню, замацаваліся па прыбярэжным участку на поўначы ад горада. Праціўнік меў выгадныя для абароны пазіцыі. Подступы да іх прыкрывае забалочаная паласа шырынёй у 2—4 кілометры. Разгарнуўшы баі па знішчэнню акружанага праціўніка, нашы часці на радзе ўчасткаў пераадолелі забалочаную паласу і ачысцілі ад гітлераўцаў лясны масіў. Адбіваючы варожыя контратакі, совецкія пехацінцы, падтрыманыя артылерыяй і авіяцыяй, захапілі рад дотаў і выбілі немцаў з населеных пунктаў Пагорш і Облуш. Адцясняючы гітлераўцаў з поўначы, захада і поўдня нашы войскі загналі праціўніка на вузкі прыбярэжны ўчастак. Сёння совецкія часці авалодалі пасёлкамі Оксхефт, Мехлінкен, Рэва і завяршылі ліквідацыю групы войск праціўніка. На полі бою асталіся тысячы варожых трупаў. Нашымі войскамі захоплены трафеі і многа палонных.

Сёння нямецкае радыё перадала наступнае паведамленне: «У раёне Гдыні мы дабіліся паўнейшага поспеху ў ходзе сваіх абарончых аперацый». У той час як Берлін перадаваў гэтае паведамленне, у раёне Гдыні ўсе аперацыі былі ўжо закончаны. Да гэтага часу рэшткі групы нямецкіх войск былі поўнасцю ліквідаваны.

* * *

4 і 5 красавіка нашы цяжкія бамбардыроўшчыкі наносілі ўдары па ваенных аб'ектах праціўніка ў горадзе Брэслаў. У выніку бамбардыроўкі ўзнікла многа пажараў, якія суправаджаліся моцнымі выбухамі.

* * *

Войскі 4-га Украінскага фронта з баямі прасоўваліся ўперад у цяжкіх умовах горна-лясістай мясцовасці. Праціўнік, які ўмацаваўся на вышынях ля дарог і далін, аказвае моцнае агнявое супраціўленне. Нашы стралковыя падраздзяленні, суправаджаемыя артылерыяй, абходзяць апорныя пункты немцаў і атакуюць іх з флангаў і тылу. Прасоўваючыся ўздоўж ракі Ваг, совецкія часці з боем авалодалі чэхаславацкім горадам Ружамберок — важным вузлом шляхоў зносін. На адным участку байцы стралковага батальёна капітана Сінькова разграмілі гарнізон нямецкага апорнага пункта і захапілі 4 гарматы, 17 мінамётаў і 36 кулямётаў. У другім раёне атрад на чале са старшыной Хамяковым зайшоў у тыл праціўніка. Нашы байцы раптоўна атакавалі ворага і знішчылі 6 нямецкіх кулямётаў разам з іх разлікамі.

* * *

Войскі 2-га Украінскага фронта прадаўжалі наступленне. Совецкія і румынскія часці, авалодаўшы ўчора апорным пунктам абароны немцаў Гандлова, накіраваліся па горнай даліне да чэхаславацкага горада Прэвідза. Прасунуўшыся ўперад на 15 кілометраў, нашы войскі зламалі варожае супраціўленне і ўварваліся на вуліцы горада. Усю ноч ішлі вулічныя баі, у ходзе якіх праціўнік панёс вялікія страты. Да раніцы нашы часці поўнасцю авалодалі горадам Прэвідза — вузлом чыгунак і шасейных дарог. Немцы страцілі свой апошні апорны пункт на рацэ Нітра. Занят таксама чэхаславацкі горад Баноўцэ.

Совецкія пехацінцы, кавалерысты і танкісты, пераадолеўшы горы Малыя Карпаты, выйшлі на раўнінную мясцовасць, пакрытую лесам. Спробы гітлераўцаў затрымаць у гэтым раёне нашы наступаючыя часці, скончыліся няўдачай. Нашы войскі адкінулі немцаў і ў выніку імклівай атакі авалодалі чыгуначным вузлом і горадам Малацкі. Праціўнік панёс вялікія страты і, пад ударамі нашых войск, адступае да ракі Марава.

Паміж Дунаем і возерам Фертэ (Нойзідлер-Зее) немцы кінулі ў бой рэзервы, у тым ліку сапёрныя, зенітныя і розныя гаспадарчыя падраздзяленні. Фарсіраваўшы раку Лайта, совецкія часці занялі горад Брук і рад другіх населеных пунктаў. У гэтым раёне знішчана два батальёны пяхоты і 10 танкаў праціўніка. Совецкія лётчыкі патапілі ў Дунаі два нямецкія параходы і тры баржы з ваеннымі грузамі.

* * *

На Венскім напрамку нашы войскі ў выніку жорсткіх баёў за пераправы фарсіравалі раку Вербах і, прасоўваючыся ўперад, авалодалі населеным пунктам Обер Лаа. Ідуць баі ў паласе абарончых умацаванняў праціўніка, пабудаваных ля чыгуначнага абводу Вены. Немцы, маючы буйныя танкавыя і пяхотныя сілы, аказваюць упорнае супраціўленне. Яны не раз кідаліся ў контратакі. Усе контратакі гітлераўцаў адбіты з вялікімі для іх стратамі. Паводле няпоўных даных, за дзень баёў знішчана звыш 5 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Гэтымі днямі ў Мінску адбыўся чарговы VI пленум ЦК ЛКСМ Беларусі з удзелам сакратароў абкомаў, першых сакратароў гаркомаў, райкомаў комсамола Беларусі.

Пленум абмеркаваў пытанні:

1. Аб палепшанні палітыка-выхаваўчай работы комсамольскіх арганізацый Беларусі сярод моладзі.

Дакладчык — сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі тав. **Зімянін М. В.**

2. Аб выкананні рашэння XII пленума ЦК ВЛКСМ «Аб мерах па палепшанню работы комсамола ў школе» гомельскай і пінскай абласнымі комсамольскімі арганізацыямі.

Дакладчыкі — сакратар Гомельскага абкома ЛКСМ Беларусі тав. **Рома Ф. Д.** і сакратар Пінскага абкома ЛКСМБ тав. **Бірукоў А. А.**

Па абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя рашэнні.

Пленум аслабаніў ад абавязкаў сакратара ЦК ЛКСМ Беларусі па рабоце сярод школьнай моладзі і піянераў тав. **Чэрнікаву А. М.** у сувязі з пераходам яе на іншую работу.

Пленум выбраў членамі бюро ЦК ЛКСМ Беларусі тт. **Палякова Я. Е., Фесько В. І. і Котава В. І.**

ПЕРАД МАСАВАЙ СЯЎБОЙ

(Гутарка з сакратаром Дзержынскага РК КП(б)Б тав. С. ПЯТКЕВІЧАМ)

108 калгасаў Дзержынскага раёна павінны засеяць у гэтым годзе 21.260 гектараў яравых культур і 300 гектараў гароду. На выкананне гэтага плана мабілізуюцца ўсе людскія і матэрыяльныя рэсурсы і магчымасці калгасаў.

Падрыхтоўку да сяўбы раён пачынаў з засыпкі насення і ачысткі яго. Такія культуры, як авёс, ячмень, бульба, былі засыпаны адразу, бо гэтага насення ў калгасах хапала. Цяжэй было з насеннем шпаніцы і ільну, якога ў сваім раёне не хапала, і прышлося звярнуцца за дапамогай у суседнія раёны.

Другім важным пытаннем падрыхтоўкі да сяўбы быў рамонт машын і сельгасінвентару, накапленне ўгнаенняў і вывазка ў поле торфу. Калгасы раёна яшчэ па санчнай дарозе вывезлі ў поле 36.000 тон гною і 31.000 тон торфу. Праўда, гэтых угнаенняў недастаткова, каб забяспечыць павышэнне ўраджайнасці паводле намечаных планаў. І калгасы раёна скарыстоўваюць зараз кожны перадпасеўны дзень для таго, каб дадаткова вывезці ў поле ўгнаенне і тым самым дабіцца павышэння ўраджайнасці ў 1945 годзе.

У калгасах, соўгасах і МТС раёна завяршаецца праверка гатоўнасці да палявых работ. Выяўляюцца істотныя недахопы ў падрыхтоўцы да сяўбы паасобных калгасаў. Калгаснікі сельгасарцелі імені Калініна выявілі, што ў калгасе «Праца», Негарэльскага сельсовета, запушчаны коні і калгас апынуўся ў такім становішчы, што без карэннага палепшання справы не зможа своечасова распачаць сяўбу. Праверкай выяўлена, што не гатовы да выхаду ў поле і калгасы «Прамень социялізма», імені Дзержынскага і імені Леніна. Праведзены нядаўна пробныя выезды ў поле дапамаглі выправіць буйныя недахопы ў падрыхтоўцы да палявых работ коней, збруі, плугоў, боран.

Выявіліся і перадавыя калгасы, якія заслужана дзяліліся вопытам сваёй работы з трыбуны абласной нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі Міншчыны. Возьмем, напрыклад, калгас імені Калініна, Негарэльскага сельсовета. У гэтым калгасе даўно падрыхтавана высокаякаснае насенне, адрамантаваны ўвесь інвентар, вупраж, калёсы.

У калгасе імені Калініна арганізаваны 9 звеньняў высокага ўраджаю, якія на справе змагаюцца за высокі ўраджай. Звяно калгаснікаў Бернатовіч вывезла на прымацаваны да яе ўчастак зямлі ў 18 гектараў 188 тон торфу, 360 тон гною. Звяно сабрала 41 цэнтнер птушынага памёту і попелу для падкормкі пасеваў яравых культур. Забяспечыўшы палі ўгнаеннямі, звяно з поўнай падставай абавязалася дабіцца ў 1945 годзе па 18,5 цэнтнера збожжа з гектара. Поспехі гэтага калгаса з'яўляюцца вынікам сістэматычнага правядзення агітатарамі палітмасавай работы.

Па прыкладу калгаса «Комінтэрн», Рубілкаўскага сельсовета, нашага раёна, які ўнёс у фонд насеннай дапамогі найбольш пацярпеўшым калгасам 250 цэнтнераў збожжа, пачаўся збор насення і ў другіх калгасах. Звыш 12.000 пудоў насення ўжо сабрана і накіравана ў суседнія раёны. Гэта прыклад высокай свядомасці калгаснікаў нашага раёна, якія, не гледзячы на ўсе цяжкасці і разбурэнні, мабілізуюць унутраныя рэсурсы на дапамогу суседзям.

Калгасы Дзержыншчыны завяршаюць апошнія падрыхтаванні да масавых палявых работ. І ў гэтай справе выключную ролю адыгрываюць перадавыя людзі калгаснай вёскі — агітатары. Сваю штодзённую практычную работу яны спалучаюць з агітацыйна-масавай работай у звеннях і брыгадах. Растлумачваючы калгаснікам асновы статута сельскагаспадарчай арцелі і важнейшыя рашэнні партыі і ўрада адносна сельскай гаспадаркі, агітатары на жывых прыкладах даводзяць вялікае значэнне законаў аб дадатковай аплаце працы, заахвочваюць людзей на социялістычнае спаборніцтва за лепшае ворыва і сяўбу.

Узорна падрыхтаваўся да веснавой сяўбы калгас «Ленінскі шлях», старшынёй якога працуе тав. Бандарэнка. У гэтым калгасе ёсць пяць агітатараў, якія яшчэ ў доўгія зімовыя вечары вялі агітмасавую работу сярод старых калгаснікаў і жанчын, а пасля арганізавалі гурток па вывучэнню важнейшых рашэнняў партыі і ўрада, і гурток па вывучэнню кнігі таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза».

Пачынаюцца палявыя работы. У бліжэйшыя дні ўсе калгаснікі, ад старога да падлетка, выйдуць у поле, каб на добра апрацаванай глебе своечасова пасеяць яравыя і дабіцца высокага ўраджаю. Разам з усімі калгаснікамі ў поле выйдуць і агітатары. Каля 500 агітатараў аб'яднаны ў 18 агіткалектывах, якія будуць працаваць у брыгадах і звеннях у полі, там, дзе вырашаецца поспех барацьбы за ўраджай.

Падрыхтавалі моцных коней

Добрых коней падрыхтавалі да веснавой сяўбы калгаснікі сельгасарцелі «Перамога». Абласная камісія, якая нядаўна была ў нас і знаёмілася з падрыхтаванасцю да сяўбы, прызнала, што нашы коні — лепшыя ў раёне і абласці.

Гэтым зацікавіліся некаторыя конюхі суседніх раёнаў. На абласной нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі яны распытвалі нас, як мы даглядаем нашых коней. У нас пыталіся, чым мы кормім сваіх коней, што яны такія сытыя, і калі поім іх.

Уся справа — у старанным доглядзе каня. А для гэтага нашы конюхі не шкадуюць ні часу, ні сіл. Яны старанна кормяць коней, чысцяць іх і поюць заўсёды своечасова.

Яшчэ з восені мы склалі кармовы баланс, вызначылі поўную колькасць корму для кожнага каня. А лепшыя кармы адклалі на вясну — на час сяўбы.

Выдаткоўвалі кармы эканомна. І вось цяпер, калі коні пастаўлены на перадпасеўны адпачынак, мы можам дадаткова падкарміць іх спецыяльна выдзеленымі на гэта кармамі.

На час сяўбы мы забраніравалі на кожнага рабочага каня столькі корму, што яго хопіць, каб утрымліваць каня ў добрым стане незалежна ад нагрузкі на палявых работах.

Наш калгас — вялікі. Гэтай вясной нам трэба засеяць 525 гектараў яравых культур. Усю гэтую плошчу павінны апрацаваць 46 рабочых коней калгаса, якія замацаваны за 5 паляводчымі брыгадамі. Каб павялічыць пагалоўе коней, калгаснікі захавалі і гадуюць 19 штук маладняка.

Рыхтуючы да сяўбы каня, калгаснікі загадзя паклапаціліся і пра вупраж і збрую. На кожнага каня падрыхтаваны новыя пастромкі, лейцы, на кожную пару коней адрамантавана па 3 плугі.

Мы выйдзем на палявыя работы дружна і арганізавана.

ІВАН АНТОНЧЫК,
старшыня калгаса «Перамога», Уздзенскага раёна.

Прывучылі да працы тысячу кароў

ХОЦІМСК. (Кар. «Звязды»). У мінулым годзе калгаснікі сельгасарцелі «Большэвік», Вяліка-Ліпаўскага сельсовета, прывучылі да працы 30 кароў. На гэтых каровах калгаснікі вывозілі гной, праводзілі баранаванне і іншыя гаспадарчыя работы. Гэта дапамагло калгасу своечасова правесці ўсе сельскагаспадарчыя работы. Рыхтуючыся да веснавой сяўбы гэтага года, калгаснікі дадаткова прывучылі да працы яшчэ 30 кароў.

На прыкладу калгаснікаў сельгасарцелі «Большэвік» 150 калгаснікаў суседніх арцелей таксама прывучылі да працы сваіх кароў. Вопыт калгаснікаў сельгасарцелі «Большэвік» цяпер распаўсюджваюцца па ўсяму раёну. 60 кароў прывучана да працы ў калгасе «Совецкая Беларусь», Боханаўскага сельсовета. Усяго ў раёне прывучана да працы 1.000 кароў. Для гэтых кароў на час веснавой сяўбы выдзелена дастатковая колькасць кармоў.

НА ПАЛЯХ

БРЭСТ. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»). Ужо некалькі дзён, як устанавілася цёплае надвор'е. Падсыхае абмытая дажджамі зямля. І адразу на больш сухіх мясцінах паявіліся першыя аратыя. Яны пачынаюць першую веснавую сяўбу пасля вызвалення.

Падрыхтаванымі сустрэлі вясну сяляне Брэсцкага раёна. Тут своечасова адрамантавана больш 4.000 плугоў і столькі-ж боран, створан насенны фонд для дапамогі сем'ям франтавікоў, партызан і інвалідаў Айчыннай вайны. У раёне завяршаецца надзел батракоў і беднякоў зямлёй былых нямецка-панскіх маёнткаў, створаных акупантамі.

Яшчэ 26 сакавіка сяляне вёскі Вялікая Курніца, Брэсцкага раёна, выйшлі ў поле. Узарана каля 10 гектараў глебы пад ярыну, а па зяблеваму ворыву пасеяны першыя 4 гектары раннята аўса. Некалькі дзён таму назад сяляне Гершанаўскага сельсовета таксама пачалі выбарачнае ворыва, а 29 сакавіка пасеялі першыя гектары ранніх яравых.

Пачалася сяўба і ў вёсцы Азяты, Жабінкаўскага раёна. У глебу ўкінуты першыя зярняты.

Разгортваюцца палявыя работы і ў іншых раёнах. Сяляне выйшлі ў поле, каб выканаць сваё абавязацельства, узятае на другім абласным сходзе,—хутка і высокаякасна правесці сяўбу, зняць высокі ўраджай яравых.

Пачынаецца барацьба за пяршынства ў социялістычным спаборніцтве з сялянамі Пінскай абласці.

ПЕРШЫЯ ПОСПЕХІ

ПІНСК. (Па тэлефону). Цёплае надвор'е спрыяе разгортванню палявых работ у абласці. На ўзвышаных месцах ідзе сяўба. На 30 сакавіка калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі абласці засеян ужо 1.421 гектар ранніх яравых культур. Асабліва паспяхова разгортваецца сяўба ранніх яравых культур у Жабчыцкім раёне. Тут пасеяна 717 гектараў. У Целеханаўскім раёне пасеяна 350 гектараў, у Іванаўскім—200, у Лагішчанскім—112 гектараў.

СІЛЮЎ.

Пачаліся трактарныя работы

РУДЗЕНСК, 5 красавіка. (БЕЛТА). У калгасе імені 16-ці партызан трактарная брыгада тав. Пауменка Дукорскай МТС пачала палявыя работы.

Астатнія трактарныя брыгады гэтай МТС выехалі ў калгасы ў поўнай гатоўнасці. Яны забяспечаны заправачнай тарай і інструментамі для рамонту трактараў у палявых умовах.

НА ЗАКЛІК КУБАНСКІХ КАЛГАСНІКАЎ

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Кар. «Звязды»). Калгаснікі сельгасарцелі «Іскра» аднадушна адобрылі зварот кубанскіх калгаснікаў і калгасніц з арцелі імені Чырвоных партызан аб арганізацыі ўсесаюзнага социялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года.

Калгас «Іскра» поўнасцю завяршыў падрыхтоўку да сяўбы — засыпаны і ачышчаны насенныя і страхавыя фонды, адрамантаван інвентар і збруя, у добрым стане знаходзіцца цягло. На калгасныя палі вывезена каля 3 тысяч вазоў гною, сабрана 40 цэнтнераў попелу і 32 цэнтнеры птушынага памёту. Уступаючы ў социялістычнае спаборніцтва, калгаснікі абавязаліся сабраць з кожнага гектара 160 цэнтнераў бульбы і не менш 13 цэнтнераў збожжавых культур. Сяўбу збожжавых культур калгаснікі рашылі правесці за 8 рабочых дзён.

Калгаснікі першымі ў раёне выбарачным парадкам прыступілі да палявых работ. У першы дзень асабліва вызначыліся старыя калгаснікі — 65-гадовы Русак і 75-гадовы Варанкевіч, якія ўзаралі за дзень па 0,60 гектара.

Да палявых работ выбарачным парадкам прыступілі і другія калгасы раёна.

Сход сялян Баранавіцкай абласці

БАРАНАВІЧЫ. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»). 31 сакавіка з самага рання з 15 раёнаў у абласны цэнтр пачалі з'язджацца сяляне, партыйныя і совецкія работнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі. Гэта былі ўдзельнікі абласнога схода сялян.

7 гадзін вечара. Упрыгожаны зал кінатэатра «Комсамолец» запоўнілі дэлегаты. Старшыня выканкома абласнога Совета дэпутатаў працоўных тав. Бандарэнка адкрывае сход. Выбіраюцца кіруючыя органы схода.

Пад гром апладысментаў прысутныя выбіраюць ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышом Сталіным. У чэсць правадыра народаў з залы нясуцца ўсхваляваныя воклічы. Аркестр выконвае гімн Совецкага Саюза.

З дакладам аб падрыхтоўцы і правядзенні веснавой сяўбы выступае сакратар абкома КП(б)Б тав. Тур.

Дакладчык гаворыць аб тых велізарных стратах, якія нанеслі нямецкія захопнікі народнай гаспадарцы абласці. Яны спалілі і зруйнавалі больш 44.700 дамоў у гарадах і 26.000 дамоў у вёсках. Яны знішчылі або вывезлі ў Германію 54.000 коней, 100.000 галоў буйнай рагатай жывёлы, 157.000 свіней, 175.000 авечак. Нямецкія захопнікі вывезлі 600 трактараў, адабралі ў 14.700 сялянскіх гаспадарак 78.000 гектараў зямлі, якую дала ім совецкая ўлада. Ад рук гітлераўскіх катаў загінулі тысячы мірных жыхароў, а многія тысячы былі вывезены імі ў праклятую Нямеччыну.

Бязлітаснай народнай вайной адказалі працоўныя абласці на здзекі акупантаў. Народныя мсціўцы пускалі пад адкос воінскія эшалоны, рвалі тэлефонна-тэлеграфную сувязь, забівалі нямецкіх грабежнікаў і іх паслугачоў. Працоўныя верылі ў перамогу Чырвонай Арміі, — гаворыць дакладчык, — верылі ў свае сілы, верылі ў непераможнасць сваёй Радзімы. Прышло свята і на нашу вуліцу. Чырвоная Армія назаўсёды выгнала немцаў з нашай роднай зямлі. Беларускі народ, з'еднаны ў адзінай дзяржаве, хутка ўзяўся за адбудову разбуранай ворагам народнай гаспадаркі.

Дакладчык прыводзіць канкрэтныя лічбы і факты праробленай работы ў абласці пасля вызвалення. Каб дапамагчы Чырвонай Арміі хутчэй прасоўвацца на захад, 28.000 сялян працавалі на аднаўленні мастоў і дарог. Рукамі працоўных адноўлена 276 кілометраў сувязі. Нямецкія акупанты разбурылі ўсе школы, культурныя і медыцынскія ўстановы. За кароткі час у абласці адноўлены 273 школы, адкрыты медпункты, культурныя ўстановы, хаты-чытальні, у кожным раёне адноўлена МТС.

Выконваючы пастанову партыі і ўрада аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год, сяляне абласці па-баявому рыхтуюцца да правядзення сяўбы, арганізавана распачынаюць палявыя работы. Сялянам абласці вернута ўжо 75.000 гектараў зямлі, якая была адабрана ў іх нямецкімі захопнікамі.

Дакладчык заклікае сялян усімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі, у сціслыя тэрміны і высокаякасна правесці веснавую сяўбу, хутчэй аднавіць разбураную ворагам народную гаспадарку.

Пасля даклада адзін за другім на сцэну паднімаюцца сяляне, старшыні калгасаў, рабочыя соўгасаў і МТС, партыйныя і совецкія работнікі. Усе яны выказваюць падзяку большэвіцкай партыі, правадыру народаў вялікаму Сталіну, сваёй вызваліцельніцы Чырвонай Арміі.

Старшыня калгаса «17 верасня», Несвіжскага раёна, тав. Папоў расказвае ўдзельнікам схода, як бурна рос іх калгас да Айчыннай вайны. Адразу-ж пасля выгнання нямецкіх захопнікаў сяляне аднавілі свой калгас. Калгаснікі па-большэвіцку сустракаюць веснавую сяўбу, паспяхова аднаўляюць усе галіны арцельнай гаспадаркі. У калгасе ёсць ужо 60 галоў буйнай рагатай жывёлы, ёсць 20 коней. У гэтым годзе калгаснікі абавязаліся сабраць з кожнага гектара не менш 15 цэнтнераў збожжа. Перакананаўшыся ў перавазе калгаснага ладу перадавыя сяляне-аднаасобнікі ўступаюць у калгас. Нядаўна 11 аднаасобных гаспадарак падалі заявы з просьбай прыняць іх у калгасную сям'ю.

Аб добрай падрыхтоўцы да сяўбы, а дапамозе сем'ям ваеннаслужачых расказаў селянін Чорнагрэбель з Лошыцкага сельсовета, Новамыскага раёна.

Вопытам работы па падрыхтоўцы да сяўбы дзеляцца сяляне Гаўрыльчык — дэлегат Вельканаўскага сельсовета, Слонімскага раёна, Роцкі — дэлегат Асташанскага сельсовета, Любчанскага раёна, др. Усяго ў спрэчках выступілі 22 дэлегаты.

Удзельнікі схода цёпла сустрэлі выступленне сакратара ЦК КП(б) Беларусі тав. Маліна, які заклікаў сялян у кароткія тэрміны і высокаякасна правесці веснавую сяўбу, хутчэй ліквідаваць сляды нямецкага гаспадарачня.

Сход паслаў прывітальную тэлеграму асабоваму саставу часці, якой перадана танкавая калона, пабудаваная на сродкі працоўных Баранавіцкай абласці.

Дэлегатамі схода прынят зварот да сялян Баранавіцкай абласці аб разгортванні социялістычнага спаборніцтва за лепшае і хутчэйшае правядзенне веснавой сяўбы і заваяванне высокага ўраджаю.

Пад бурныя апладысменты ўдзельнікі схода прынялі прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

АБ АРХІТЭКТУРЫ НОВЫХ ДАМОЎ У АДНАЎЛЯЕМЫХ ВЁСКАХ

★

Архітэктары:
І. І. ВАЛОДЗЬКА, Е. М. МАРШАК.

★

У газеце «Звязда» за 25 сакавіка г. г. была змешчана карэспандэнцыя і фотаздымак пра аднаўленне дамоў у калгаснай вёсны «Новае жыццё», Клімавіцкага сельсовета, Гомельскага раёна. У сувязі з гэтым мы рашылі выказаць некалькі заўваг наконт якасці новаадбудаваных дамоў і іх далейшага палепшання і ўдасканалення.

На здымку адноўленай вёскі відаць паасобныя дамы, пабудаваныя калгаснікамі па «свайму плану». Некаторыя лічаць, што будаўніцтва такога роду з'яўляецца не зусім поўнацэнным, паколькі яно выканана ў духу старых будаўнічых традыцый у вёсцы, а не па распрацаваных архітэктарамі праектах, якіх, дарэчы сказаць, накапілася ўжо многа.

Азнаёміўшыся больш падрабязна са змешчаным на здымку на пярэднім плане домам калгасніцы Караткевіч (злева), мы зрабілі вывад, што гэты дом, па тыпу якога забудавалася і ўся вёска, мае здаровую аснову і дае магчымасць для яго далейшага архітэктурнага афармлення і лепшай арганізацыі ўнутранай яго прасторы.

Будынак мае размер 6 х 6 метраў з халоднай прыбудовай 3 х 3 метры. Будынак такіх размераў дае магчымасць, замест існуючага плана, у будучым без якіх-небудзь значных затрат па-новаму арганізаваць унутраную яго прастору. Добра размешчаныя вокны, вытрыманых прапорцый, і іншыя элементы даюць магчымасць у будучым надаць будынку больш выразную архітэктуру. Шкада толькі, што будынак крыху нізкаваты.

Аднаўленчае будаўніцтва, якое шырока разгарнулася зараз у калгасах, накшталт таго, што мы бачым у калгасе «Новае жыццё», можна разглядаць, як будаўніцтва, разлічанае на ажыццяўленне ў дзве чаргі.

У асноўным, зруб з крыху спрошчаным планам дома і больш прымітыўным знадворным афармленнем выконваецца зараз, а давядзенне будынка да больш удасканаленага выгляду—у бліжэйшым будучым.

На малюнках 1, 2, 3 і 4 мы даем вырашэнне гэтага пытання на даным канкрэтным прыкладзе. На малюнку № 1 паказан план дома калгасніцы Караткевіч у цяперашнім яго выглядзе. На малюнку № 2 даецца варыянт змены плана ў рамках таго-ж будынка. Сутнасць рэканструкцыі заключаецца ў наступным:



1. Замест аднаго жылога пакою, у якім і вараць, і спяць, і адпачываюць, і ядуць, выдзяляюцца зусім самастойна кухня (магчыма кухня са сталовай) і чыстая палавіна (магчыма з дадатковым выдзяленнем спальнага пакою);

2. Замест звычайнай рускай печы, якая стаіць у вуглу жылой часткі будынка, будуецца палепшаная руская печ з устройствам пліты на прыпечку (пярэдняя частка печы). Печ ставіцца такім чынам, што яна сваім аб'ёмам аддзяляе кухню ад чыстай палавіны, як гэта паказана на малюнку № 2. Да печы, пры жаданні, у жылой частцы можа быць прыбудавана ляжанка або абагравальны шчыток;

3. Халодныя сенцы перагародкамі з дошак раздзяляюцца на тры часткі: невялікія сенцы пры ўваходзе, кладовую ў 10—12 кв. метраў і камору.

Па малюнку № 3 паказан дом калгасніцы Караткевіч у такім выглядзе, якім ён існуе зараз, а на малюнку № 4 паказан, як ён будзе выглядаць пасля некаторай архітэктурнай апрацоўкі дэталей. Апошняя дасягаецца таксама самымі прасцейшымі сродкамі, а іменна:

1. Вуглы зруба абшываюцца дошкамі;

2. Па выступаючых канцах страпільных ног і прышываемых брусках робіцца карніз. Па карнізнай дошцы, як і па абшыўцы вуглоў, даецца разьба па матывах народнай творчасці;

3. Робіцца палепшаны налічнік на аконных праёмах. Магчыма ўстройства акеніп;

4. Робіцца абшыты дошкамі франтон на галоўным фасадзе;

5. Замест саламянага даху робіцца дранічны або гонтавы;

6. Прызба акуратна абшываецца дошкамі, робіцца сцёк;

7. Уваход у дом афармляецца ганкам.

Усе гэтыя мерапрыемствы патрэбуюць нязначнай колькасці дадатковых будаўнічых матэрыялаў (апрача даху):

лесу круглага — 0,85 кбм.
лесу піленага — 2,87 »
пэглы — 0,5 тыс. шт.

Рабочай сілы патрэбуецца 73 чалавекадні.

Апісанае палепшанне дома падыходзіць толькі для данага будынка і яму падобных. У іншым выпадку можа быць знойдзена іншая форма яго палепшання. **Важна толькі, каб жылая частка дома была ва ўсякім разе не менш 5,5 х 6,0 метраў.**

Прапануемае намі палепшанне архітэктуры новага жылога будынка калгасніцы Караткевіч зноў-такі нельга разглядаць як тыповае палепшанне або поўны рацэпт. Апрача гэтага спосабу, могуць быць знойдзены і іншыя шляхі далейшага палепшання калгаснага жылля, у якім могуць быць улічаны таксама і рознастайныя асабістыя густы калгаснікаў.





У СЛОНІМСКАЙ МТС

Першымі ў Слонімскую МТС прышлі трактарысты Нікалай Супрун, Аляксандр Жывулька, брыгадзір трактарнай брыгады Сазановіч і старшы механік Владзімір Канстанцінавіч Лакуцін.

Гэта было летам 1944 года. Уцякаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, фашысцкія вылюдкі знішчылі МТС.

Трактарысты знайшлі на пажарышчы былой сядзібы абгарэлыя дэталі, якія валяліся сям-там, і некалькі оставаў трактараў. А на палях у гэты час даспеў ураджай. Трэба было хутчэй убіраць дабро, каб яно не асыпалася на зямлю.

З таго часу і пачалося аднаўленне МТС. Ачысцілі частку памяшкання былой майстэрні, устанавілі горан. Спачатку трактарысты горача ўзяліся рамантаваць жняяркі, вырабляць сярпы, па магчымасці забяспечваць сялян уборачнымі прыладамі. Адначасова праводзіліся вялікія работы па зборцы і рамонту трактараў.

Да пачатку масавага абмалоту ў МТС сабралі, адрамантавалі і пусцілі ў ход 5 трактараў, якія ажывілі работу складаных малатарань.

Усю зіму не спыняліся рамонтныя работы. Людзі ўпорна і настойліва працавалі ў кузні, майстэрні. Было многа цяжкасцей. Часам нехапала той ці іншай часткі, не падыходзілі дэталі, але ўмелыя вопытныя рукі рамонтнікаў, гарачае жаданне зрабіць сваю МТС моцнай перамаглі ўсе цяжкасці.

На рамонтных работах асабліва вызначыліся трактарысты-рамонтнікі Нікалайчык, Супрун, брыгадзіры трактарных брыгад Сазановіч і Ціхановіч, старшы механік Лакуцін і кавалі Ледвіг Леонцій і Ледвіг Владзімір. Гэтыя людзі штодзённа перавыконвалі сваю норму ў паўтара-два разы.

У МТС ішло папаўненне. У канцы лютага Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум зрабіў першы выпуск трактарыстаў. 11 з іх накіраваны на работу ў Слонімскую МТС. Свае тэарэтычныя веды маладыя трактарысты зараз паглыбляюць на практычнай рабоце. Для іх арганізавана практычная вучоба. Маладыя трактарысты змогуць самастойна кіраваць трактарамі.

Гэтымі днямі ў МТС адбылася прыёмка адрамантаваных трактараў і іншага інвентару дзяржаўнай камісіяй. У часе праверкі трактарнага парка арганізавалі пробны выезд. На двары сядзібы стаяць выстраеныя ў рад 8 трактараў. Бесперапынна гудуць маторы. Адзін за другім пайшлі па вуліцы пасёлка сталёвыя коні. Дзяржаўная камісія ў акце прыёмкі адзначыла, што рамонтныя работы выкананы на «добра».

Апрача абслугоўвання падсобных гаспадарак, вопытнага ўчастка сельскагаспадарчага тэхнікума, соўгасаў, МТС апрацуе і засее значную частку палёў сялянам-аднаасобнікам, сем'ям франтавікоў Жыровіцкага, Мельканаўскага і іншых сельсоветаў. Падпісаны ўжо дагаворы з сялянамі вёскі Грынкі, Жыровічы і многіх другіх.

Апошнія дні перад выездам у поле. Прыводзяцца ў парадак падручныя прылады: вёдры для бензіна, маслёнкі, ключы, малаткі і інш. Часта ў сядзібе то тут, то там загудзе матор — ідзе дэталёвая выпрабаванне.

З нецярпеннем чакаюць тут дня выезду ў поле. І дзень гэты не за гарамі. Падсыхае глеба пад цёплымі праменнямі веснавога сонца.

Хутка ў поле...

Г. СТРАШКО.

Гор. Слонім, Баранавіцкай абласці.

На закрашынскіх балотах

...кім і недаступным было ў мінулым ...шча «Закрашынскі мох». Густы ...як, чарот, дрыгва — вось што прад...ла з сябе гэтая мясцовасць. Толькі ...чыла настойліва прабіраліся сюды. ...ыло многа качак і дзікіх звяроў. ...аходзілі годы. На Закрашынскія ба...'явіліся совецкія інжынеры, тэхнікі. ...вымяралі глыбіню торфу, працавалі ...го выпрабаваннем, ставілі пікеты і ...лі на карту.

— Будзем будаваць жыццё на вашай ...е, — гаварылі сялянам тэхнікі. ...кое можа быць жыццё ў балоце, дзе ...жа ступаць нага чалавека», — ду...людзі.

...На балота з рыдлёўкамі, піламі вый...зесяткі людзей. Хуткімі тэмпамі пра...лася магістральная канава, асушы...калектары. На магістралі вада пай...рэчку Ведрыч, уносячы за сабой ...адовую гніль. Чалавек моцна стаў на ...е. Страшнае ў мінулым балота стала ...ацца сіле чалавека. Хутка балота ...цвёрдым грунтам. На клетках па...здабыча торфу, а побач з клеткамі, ...вышшы, пачаў узнімацца рабочы па...

Так стаў вырастаць торфазавод «За...нскі мох».

...од хутка рос і арганізацыйна ўма...ўся. З 1939 года ён стаў ужо важ...ым пастаўшчыком паліва Добрушскай ...овай фабрыцы. На торфараспрацоўках ...ўжо было занята 700 рабочых, якія ...он здабывалі да 24 тысяч тон торфу. ...пягам часу выбарка тарфяной масы ...больш механізавалася. У 1940 годзе ...лоце працавалі 4 элеватарныя ма...ы. Гатовы сухі торф вывозіўся двума ...озамі па пракладзенай вузкакалей...Апрача таго, працавалі два тракта...чатыры аўтамашыны.

...орфазавод стаў самым буйным прад...ствам у раёне. Рабочыя размясціліся ...новых светлых дамах, пабудаваных ...й вуліцай. Рабочы пасёлак стаў на...ыцца гарадком. Тут быў свой радыё..., добра абсталяваны клуб, амбула...ры, дзіцячы сад, школа, электрастан...ы, гукавая кіноўстаноўка. Завод меў ...падсобную гаспадарку. Ён жыў ...ва і культурна. Летнімі вечарамі, ...ад працы, над балотам несліся звон...ія песні дзяўчат і хлапцоў. У клубе ...ядаліся кінокарціны, слухаліся лек...ы даклады.

* * *

...йна абарвала мірную працу совецкіх ...ей. Многія рабочыя пайшлі на фронт ...партызаны. Завод трывожна заціх. У ...ні 1941 года сюды прышлі немцы. ...тых, хто астаўся на месцы, настала ...я ноч нямецкай няволі. Фашысты ...залі. Яны расстралялі дырэктара ...ы Фёдара Фраловіча з сям'ёй, сям'ю ...ага Вертліб і другіх.

...1943 годзе акупанты пад страхам смерці прымусілі «адпавіць» работу на заводзе. Яны ўстанавілі свой дзікі «парадак». Рабочы дзень прадаўжаўся 16 гадзін, кармілі рабочых баландой. За найменшае падазрэнне — збіенне і расстрэлы. Так за нішто былі збіты шампаламі Спепаніда Варажунова, Іосіф Сікорскі, 63-гадовы Зміцер Квач і другія.

Але совецкія людзі не пакарыліся фашысцкім зверам. Яны давалі нізкую выпрацоўку на здабычы торфу, псавалі яго ў часе сушкі і транспартыроўкі, выводзілі са строю капальныя машыны. Акупанты шалелі. Але дні іх былі ўжо злічаны. Фронт набліжаўся да Закрашынскіх балот.

Упякаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, немцы разбурылі ўсю заводскую гаспадарку. Яны спалілі электрастанцыю з цыркулярным станком, разграбілі ўсё вытворчае і транспартнае абсталяванне, прывялі ў негодную торфакапальныя машыны. Не ўдалося бандытам толькі спаліць заводскія будынкі.

* * *

З прыходам Чырвонай Арміі на заводзе адразу пачаліся аднаўленчыя работы. Усё патрэбна было пачынаць нанова. Участкі здабычы і асушкі торфу зараслі хмызняком. Асушальная сетка выйшла са строю. Агрэгаты былі прыведзены ў негодную. Немцы знялі з іх важнейшыя часткі і вывезлі ў Германію.

— Усё-ж завод жыў і жыць будзе,— цвёрда заявілі рабочыя.

За параўнальна кароткі час яны прывялі ў парадак торфараспрацоўчыя ўчасткі, адрамантавалі адну капальную машыну і прыступілі да выпуску прадукцыі.

Ужо за 1944 год рабочы калектыў завода даў краіне тысячы тон торфу. Людзі працавалі па-франтавому. Брыгада Надзі Куржанок у 30 чалавек за змену выпрацоўвала 28.000 торфацаглін пры плане ў 25.000. За ўвесь летні сезон гэтая брыгада нарыхтавала 2.400 тон торфу.

Жыццё на заводзе аднаўляецца з кожным днём. Нанова адбудавана электрастанцыя з цыркуляркай, працуе пякарня, сталовая, дзіцячы сад, амбулаторыя, клуб і школа. Адрамантаваны жылыя памяшканні для рабочых.

Зараз завод рыхтуецца да летняга сезона 1945 года. За зімовы час выпушчаны з рамонту 2 элеватарныя машыны, 1 матавоз, заканчваецца рамонт трэцяй капальнай машыны, абсталёўваецца механічная майстэрня. У рамонце машын асаблівую стараннасць праявіў слесар тав. Ляшко. Да новага сезона рыхтуюцца і кадры. 10 дзяўчат прайшлі курсы па падрыхтоўцы машыністаў-параўшчыкоў.

Н. БАНДАРЧУК.
Васілевіцкі раён.

У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ МЕДЫЦЫНСКІМ ІНСТЫТУЦЕ

...ыш 130 навуковых работнікаў наліч...калектыў Беларускага дзяржаўнага ...цынскага інстытута. Тут працуюць ...мікі Леонаў, Пракапчук, члены — ...пандэнты Акадэміі навук БССР пра...ры Мелкіх, Голуб, заслужаныя дзеячы ...: прафесары Корчыц і Шапіра, відныя ...сары Фрыд, Трусевіч, Бабук, Касма...і, Карпілаў, Акерман, Пятроў і дру...Сярод іх адзінаццаць ордэнаносцаў.

...інстытуце апрача падрыхтоўкі кадраў ...дзіцца вялікая навуковая работа. У ...ым годзе тут выкананы 34 навуковыя работы. Прафесар Корчыц падрыхтаваў да друку кнігу «Кіраўніцтва для ўрачоў», у якой апісан шматгадовы вопыт прафесара па пытаннях хірургіі. Прафесар Яхімовіч напісаў доктарскую дысертацыю, у якой даў новае тлумачэнне распаўсюджання нервовага імпульса ўздоўж нерва.

Цікавыя навуковыя работы закончылі ў мінулым годзе прафесары Пятроў, Голуб, дацэнт Дазорцава, асістэнт Мядзведзева і др.

У гэтым годзе інстытутам намечана 68 навуковых работ.

ГЕРОІ СОВЕЦКАГА САЮЗА, СЫНЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Капітан Завадскі

...З-за Масквы, з-пад Ногінска і Шчол...падымаліся нашы самалёты. Ішлі ...зі, ішлі цэлыя эскадрыллі. Яны з фо...праносіліся над нашымі часцямі, пе...калі лінію фронта і рвалі на кавалкі ...ны войск праціўніка, грамілі яго тан...я злучэнні. Пад самае неба ўзнімаліся ...рныя слупы зямлі, перамешанай з аб...амі варожай тэхнікі.

...ыло гэта ў незабыўныя дні гераічнай ...оны Масквы.

...адзін з гэтых цяжкіх дзён атрымаў ...ое хрышчэнне сержант авіяцыі, вы...белакуры хлопец з Оршы, Владзімір ...гіевіч Завадскі. Той самы Валодзя, які ...ў часе вучобы ў 9-м класе часта на...аў Аршанскі аэраклуб.

...шчэ сонца не ўзыходзіла, а ён спя...ся на аэрадром, дзе праводзіліся вучэб...палёты . У гэтых палётах ён быў та...жа выдатнікам, як і ў школе. Пасля ...чэння дзесяцігодкі Завадскі паехаў ...ыцца ў Мінскі аэраклуб. А ў 1939 го...пайшоў у Чырвоную Армію, у авія...лу. Праз год ён скончыў яе.

...Н-скі авіяполк Владзіміра залічылі ў ...1 годзе. І ўжо восенню таго года са...ёт, за штурвалам якога сядзеў 22-га...ы Владзімір, перасякаў лінію фронта, ...аў смертаносны груз на галовы непа...ых прышэльцаў.

...е пра славу думаў Завадскі. Немцы ...ля Масквы. Мужна і храбра абараняў ...сталіну Радзімы. Родная Беларусь, спа...лыя вёскі стаялі перад вачыма. Ён з ...э большай пільнасцю ўглядаўся ўніз, ...былі замаскіраваныя батарэі, склады, ...оны жывой сілы ворага.

— Нішчыць, нішчыць дашчэнту, помсць за ўсё!—была ў галаве думка. Зноў ...ноў ад самалёта адрываліся авіябомбы ...яцелі ўніз, зноў успышкі выбухаў сведчылі, што цэль накрыта, што толькі шматкі астаюцца ад фашысцкіх нягодніка ў.

...З першых лістападаўскіх баёў за Маскву Владзімір Завадскі і яго экіпаж удзельнічалі ў разгроме нямецка-фашысцкіх войск у раёнах: Кліп, Солнечнагорск, Рагачоў, Яхрома, Валакаламск, Яхнаў, Гжацк, Вязьма, Сухінічы і г. д.

Баявыя заслугі Завадскага пры абароне Масквы совецкі ўрад высока ацаніў, узнагародзіўшы яго ордэнам Чырвонага Сцяга і медалем «За отвагу».

А пасля, калі захлынуліся ў сваёй крыві варожыя атакі і пад магутнымі ўдарамі Чырвонай Арміі лінія фронта адкацілася на некалькі сот кілометраў ад Масквы, самалёт Завадскага віхурай праносіўся над варожымі пазіцыямі на Украіне. Колькі каштоўных вестак прыносіў Завадскі для войск 2-га Украінскага фронта!

— Яго ведае ўвесь фронт, — гаварылі пра яго таварышы. — Лейтэнант Завадскі праславіўся як лепшы паветраны разведчык.

«У нашых падраздзяленнях выраслі выдатныя разведчыкі, — пісала пра яго 23 жніўня 1943 г. газета «Советский пилот». — Імёны лейтэнанта Завадскага, старшыны Бутрыма, малодшых лейтэнантаў Рагожкіна і Берзня вядомы ва ўсіх часцях...».

Як і раней, усе баявыя загады ён выконваў спакойна, мужна і ўмела. Ён прымаў удзел у Белгарадска-Харкаўскай аперацыі. Удзельнічаў у баях над Палтавай, Крэменчугом, Дняпрапетроўскам. Надышоў час, і нашы войскі пачалі аперацыі па фарсіраванню Дняпра. Зноў самалёт Завадскага ўзнімаецца ў паветра. З самага ранку да вечара фатаграфіруе ён размяшчэнне абаронных рубяжоў ворага, перамяшчэнне і канцэнтрацыю яго войск.

У Завадскага многа баявых эпізодаў. Вось некаторыя з іх. Было гэта 8 сакавіка 1944 года ў раёне Умані. Нізкія цяжкія воблакі клубіліся над палямі баёў. Ні адзін самалёт не падымаўся ў паветра. Вось у гэты час і запусцілі матор самалёта Завадскага. Ён рашуча сеў за штурвал, і машына адарвалася ад зямлі. Вецер кідаў машыну ў розныя бакі. Але Завадскі няўхільна вёў самалёт да намечанай цэлі. Бачнасць была зусім дрэнная. Ён знізіўся да 100 метраў і заўважыў калоны праціўніка, якія рухаліся на поўнач ад Умані. Завадскі двойчы праштурмаваў калоны, сеючы смерць і паніку ў варожым стане.

За гэты подвіг камандуючы аб'явіў Завадскаму падзяку і паставіў у прыклад лётнаму саставу ўсёй арміі.

У гэтым палёце Владзімір Георгіевіч быў ранен.

Любоў да свайго народа, да сваёй радзімы і лютая нянавісць да ворага — вось чым жыве сэрца Владзіміра. Яны дапамагаюць яму выдатна выконваць усе баявыя заданні. Яны дапамаглі выйсці пераможцам у няроўным баі з ворагам, калі на самалёт Владзіміра напалі 9 нямецкіх спярвятнікаў. На вышыні 6.500 метраў ім удалося падпаліць яго самалёт, але Завадскі прадаўжаў змагацца. Агонь пранікаў у кабіну. Становішча здавалася безвыходным. Але мужнасць не пакінула Завадскага. Сабраўшы ўсе сілы, ён павёў самалёт на сваю тэрыторыю. Праціўнік пайшоў назад. Ён лічыў, што гібель самалёта і яго экіпажа немінуча. Фашысты пралічыліся. Палаючая, параненая машына на вялікай хуткасці ішла на родную зямлю. У членаў экіпажа не было і думкі, каб пакінуць самалёт у тылу ворага. Думка пра палон абурала іх. Праз некалькі хвілін пераляцелі лінію фронта, і толькі тут Завадскі даў каманду экіпажу выпрыгнуць на парашутах і выпрыгнуў сам. А праз некалькі гадзін яны дабраліся да сваёй часці. Так Завадскі сваёй мужнасцю і адвагай выратаваў сваё жыццё і жыццё экіпажа.

Слаўны баявы шлях прайшоў Владзімір Георгіевіч. Ён непазнавальна вырас, узмужаў і загартаваўся ў жорсткіх баях з нямецкімі захопнікамі. Завадскі стаў капітанам, узорным афіцэрам Чырвонай Арміі. Звыш 130 баявых вылетаў зрабіў ён.

Яго баявыя подвігі Радзіма адзначыла новымі ўрадавымі ўзнагародамі — ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені і 2-ім ордэнам Чырвонага Сцяга. За баявыя заслугі на франтах Айчыннай вайны ўрад ЗША узнагародзіў яго ордэнам «Крыж за баявыя лётныя заслугі».

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства Владзіміру Георгіевічу Завадскаму Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР ад 26 кастрычніка 1944 года прысвоена званне Героя Совецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Золотая звезда».

Цяпер Владзімір Георгіевіч грампіць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на 2-ім Украінскім фронце. Камандаванне, афіцэрскі і сяржанцкі састаў часці, у якой служыць Владзімір Георгіевіч, прыслалі пісьмо да яго бацькоў — Георгія Фёдаравіча і Анастасіі Еўсееўны Завадскіх. У пісьме яны выказваюць шчырую падзяку бацькам-беларусам, якія ўзгадавалі і выхавалі такога воіна-патрыёта, змагара за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

«У гэтым маладым чалавеку, совецкім лётчыку, у баявой рабоце на фронце Айчыннай вайны,—пішуць яны,—праявіліся выдатныя якасці воіна Чырвонай Арміі. Усёй сілай сваіх пачуццяў ён любіць сваю Совецкую Радзіму і ненавідзіць ворага... У асобе Вашага сына мы маем не толькі выдатнага лётчыка, але і пудоўнага друга і таварыша. У нашым баявым калектыве Владзімір Георгіевіч з'яўляецца прыкладам паветранага байца, прыкладам служэння Радзіме. Усё сваё маладое жыццё ён палкам аддае ў імя перамогі і шчасця нашай Айчыны. Ён з'яўляецца ўсеагульным любімцам, заслужана карыстаецца нашай глыбокай павагай і любоўю. У ім мы бачым воіна-багатыра, які множыць славу совецкага народа, Чырвонай Арміі і совецкай зброі.

Вы маеце права ганарыцца сваім сынам, Георгій Фёдаравіч і Анастасія Еўсееўна. Ён сумленна выконвае свой абавязак перад Радзімай. Слава героям Совецкага Саюза—лепшым сынам нашай Радзімы!» Такімі словамі заканчваюць сваё пісьмо франтавікі.

І. КАЗЛОЎ.



В. Г. Завадскі.

ЧАМУ АДСТАЕ ШКЛОЗАВОД ІМЕНІ ДЗЕРЖЫНСКАГА

Нова-Барысаўскі шклозавод аднавіў сваю работу ў першыя дні пасля вызвалення горада Барысава ад нямецкіх захопнікаў. Першая прадукцыя была ўжо выпушчана ў лістападзе мінулага года.

Прайшло многа часу. За гэты тэрмін пры добра арганізаванай рабоце шклозавод мог-бы даць вялікую колькасць прадукцыі, якая вельмі патрэбна для нашай краіны.

Аднак на справе гэтага не відаць. Шклозавод імені Дзержынскага штомесячна не выконвае вытворчага плана. Так, за студзень план па аконнаму шклу выкананы на 43,3 процанта, па шклянках— на 91,3 процанта. Усяго па выдувальнаму цэху вытворчы план выкананы на 54 процанты. Не лепш абстаіць справа з выпускам прадукцыі ў лютым і сакавіку.

Невыкананне плана тлумачыцца адсутнасцю на заводзе сацыялістычных метадаў працы. Тут няма сапраўднай барацьбы за павышэнне якасці прадукцыі. Адсюль высокі сабекошт прадукцыі і вялікая колькасць браку і бою. Калі адзін метр аконнага шкла ў 1944 годзе каштаваў заводу 35 руб. 95 кап., то ў 1945 годзе сабекошт павысіўся да 39 рублёў. Адна шклянка ў 1944 годзе каштавала заводу 2 руб. 53 кап., а ў 1945 годзе сабекошт адной шклянкі ўзрос да 3 руб. 44 кап.

Сама пастаноўка працы ў выдувальным цэху няправільная. Майстар-выдувальшчык халяў атрымлівае плату за выпрацаваную халяву да яе абрэзкі, калі якасць работы яшчэ не высветлена. Патрэбна ўстанавіць аплату пасля абрэзкі халяў, прычым абрэзчыкаў неабходна перавесці па здельную аплату.

На прадпрыемстве не вядзецца сапраўднай барацьбы за зніжэнне сабекошту, павышэнне якасці прадукцыі і павелічэнне яе выпуску.

Галоўны інжынер завода тав. Караджыеў заяўляе, што ў нас, моў, брак не прападае. Шкло зноў ідзе ў ванную печ. Тут забылі аб тым, што гэта павышае сабекошт прадукцыі.

Вытворчыя сходы па абмеркаванню метадаў барацьбы за павелічэнне выпуску прадукцыі не праводзяцца. Зусім дрэнна абстаіць справа з укараненнем рацыяналізатарскіх прапаноў. Так, прапанова майстра Каспяровіча аб прымяненні спецыяльнага прыстасавання для паступовага ахалоджвання шкла, пры прымяненні якога ліквідуецца ломка ад сквазняка, толькі нядаўна рэалізавана. Рацыяналізатарская прапанова каменшчыка Макарэвіча аб ужыванні каля печаў шамотных пліт з паветранымі праслойкамі, што павялічвае выпуск прадукцыі і карысна ў справе тэхнікі бяспекі, яшчэ да гэтага часу не рэалізавана.

На прадпрыемстве зусім няма запасу паліва. Гэта прыводзіць да прастояў у рабоце. Вузкакалейка не скарыстоўваецца для падвозкі паліва, бо да гэтага часу яшчэ не адрамантаван паравоз.

Недастатковая тэмпература печаў (1.200 градусаў пры норме 1.450) прыводзіць да паніжэння якасці і браку прадукцыі.

Дрэнна абстаіць на шклозаводзе справа і з падрыхтоўкай кадраў. Не гледзячы на тое, што з пускам вялікай ваннай печы будзе патрэбна многа спецыялістаў,—падрыхтоўкай маладых кадраў тут не займаюцца.

Сродкі, адпушчаныя на аднаўленчыя работы, не скарыстоўваюцца. У першым квартале шклозаводу імені Дзержынскага было адпушчана 200 тысяч рублёў на будаўніцтва. Але гэтыя сродкі дагэтуль не асвоены.

Кіраўніцтва завода не клапоціцца і аб рэалізацыі выпускаемай прадукцыі. Так, доўгі час не рэалізавана на 200 тысяч рублёў аконнага шкла і шклянак. І гэта тады, калі насельніцтва адчувае вялікую патрэбу ў гэтай прадукцыі.

Слаба пастаўлена на прадпрыемстве палітыка-масавая работа. Гутаркі, чыткі газет праводзяцца нерэгулярна. Няма лозунгаў, плакатаў і г. д. Насценная газета па некалькі месяцаў не выпускаецца.

Шклозавод імені Дзержынскага мае ўсе магчымасці, каб выйсці з прарыву. Кіраўніцтву гэтага прадпрыемства неабходна праявіць больш ініцыятывы і зацікаўленасці ва ўсіх галінах работы. Пры добрай арганізацыі працы калектыў прадпрыемства здолее выконваць свае планы як у колькасных, так і ў якасных адносінах.

К. ГЛУШАНІН.
(Кар. «Звязды»).

РАННЯЯ ГАРОДНІНА ДЛЯ СТАЛОВЫХ

У калгасах Мінскага сельскага раёна адноўлены цяпліцы плошчаю ў 400 квадратных метраў. У сельгасарцелі «Чырвоны гароднік» паспелі ўжо гуркі, салата, радыска і цыбуля.

Першая гародніна і зеляніна перадана ў сталовую ваеннага шпіталя. У бліжэйшыя дні гародніна будзе дастаўлена ў сталовыя грамадскага харчавання.

(БЕЛТА).

АГЛЯД ДРУКУ

ПРА ПІСЬМЕННАСЦЬ І МОВУ НЕКАТОРЫХ ГАЗЕТ

Адказнейшыя задачы пастаўлены перад нашымі газетамі—рэспубліканскімі, абласнымі, раённымі. Вялікая іх роля ў грамадскім жыцці. Апрача вялікай арганізатарскай і прапагандысцкай работы, газета павінна садзейнічаць авалоданню насельніцтвам пісьменнасцю і ведамі, прывіваць яму культурныя навыкі. У цяперашні час нашы школы часта працуюць з недастатковай колькасцю падручнікаў. У такіх умовах падручнікам робіцца газета—вучні чытаюць яе, як школьную кнігу, і тады, калі гэтая газета пісьменная, вучацца па ёй, авалодваюць багаццем роднай мовы, правільнасцю напісання тэрмінаў. Калі-ж газета непісьменная, усё адбываецца наадварот.

У часе свайго гаспадарання ў Беларусі нямецкія мракабесы і іх спадручныя—нямецка-беларускія нацыяналісты— са скуры лезлі, каб апаганіць, скалечыць нашу беларускую мову, засмеціць яе. Пра гэты факт не павінна забывацца ні адна газета.

Як з усяго вынікае, пытанні мовы і пісьменнасці газет—гэта прынцыповыя пытанні, набываючыя глыбокі палітычны і культурна-асветны характар.

Аднак практыка работы некаторых нашых газет, і асабліва раённых, дае падставу сцвярджаць, што да пытанняў мовы, а часта і элементарнай пісьменнасці, дапускаюцца абыякавыя, несур'ёзныя адносіны.

* * *

Перад намі камплект газеты «Соцыялістычная праца»—орган Васілевіцкага РК КП(б)Б і выканкома райсовета дэпутатаў працоўных.

Пасля азнаямлення з гэтай газетай становіцца зусім ясна, што людзі, якія яе робяць, адносяцца да мовы неахайна, выпускаюць непісьменную газету. У кожным нумары «Соцыялістычнай працы» вельмі многа грубых граматычных памылак, непісьменна пабудаваных сказаў, небеларускіх слоў і ўсялякіх недарэчнасцей.

Для пацвярджэння сказанага дастаткова ўзяць хоць-бы адзін нумар—за 23 сакавіка г.г. У нумары змешчана справаздача аб сходзе раённай партыйнай арганізацыі. У ёй мы чытаем:

«Усё больш паляпшаецца **бытавое** жыццё калгаснікаў». Што за **бытавое** жыццё? І далей:

«Мы зусім мала **выкарысталі ўсіх магчымасцей, якія ў нас маюцца**». «**Дрэнна абстаяць справы ў рабоце** мясцовай прамысловасці». «Райспажыўсаюз нічога **не думае да сяўбы** на сваёй падсобнай гаспадарцы, а таксама **дапамогай** калгасам неабходнымі сродкамі».

Як гэта можна «думаць да сяўбы», сеяць **на** гаспадарцы, а не **ў** гаспадарцы, і як можна думаць «дапамогай», а не галавой—вядома толькі работнікам васілевіцкай газеты.

У той-жа справаздачы сустракаюцца і такія перлы:

«Сур'ёзным недахопам трэба адзначыць догляд цяглавай сілы». Рэдакцыя, відаць, хацела сказаць пра дрэнны догляд. У заметцы «Устанавіць строгую адказнасць за догляд цяглавай сілы» газета гаворыць: «трывожныя справы абстаяць з цяглавай сілай» і пытаецца: «чыя віна дрэннага ўхода і зберажэння цяглавай сілы?» Тое, што газета шукае віноўнікаў дрэннага догляду—вельмі пахвальна, але чаму яна шукае віноўнікаў зберажэння цяглавай сілы—ніяк не зразумела.

У другіх нумарах «Соцыялістычнай працы» сустракаюцца і такія выразы: «усю работу сельпо **будавала на завазімых таварах**», «у калгасе ёсць **многа бозгаспадарчасцей**», «калгас прымае **ўсё большы выгляд**» і г. д.

Работнікі васілевіцкай газеты не знаходзяць у сваім лексіконе патрэбнай колькасці вядомых кожнаму мала-мальскі пісьменнаму чалавеку беларускіх слоў і пішуць: «зала», «выжыдаць», «кірпічнай», «гвоздзі», «мебель», «спічкі», «источнікі», «ізгатаўленне», «прыастанавіць», «абразцы» і многія іншыя «абразцы».

* * *

Не лепш абстаіць справа з пісьменнасцю і ў газеце «Чырвоны барацьбіт» (г. Шклоў).

Залішнія каментарыі да такіх выразаў, узятых са шклоўскай газеты за сакавік і люты:

«Сама т. Сотнячэнка робіць збор для калгаснай жывёлы хатніх прадавольственных адыходаў у калгаснікаў».

«Па ўрачыстых вечарах, прысвечаных 27 гадавіне Чырвонай Арміі, горача абмяркоўвалі толькі што пачуты добра вядомы голас дыктара» (не думаецца нам, што іменна гэта абмяркоўвалі на ўрачыстых сходах).

«Прадстаўлены рэпертуар з гераічнай барацьбы совецкага народа гаворыць аб немалай рабоце дырэктара Карповіч над умельм падборам і сцэнічным паказам».

«На працягу лютага і сакавіка адбудаваць хаты калгаснікам, у якіх спалілі двары нямецкія вандалы».

«Сустрэлі паведамленне аб новых і магутных наступленнях Чырвонай Арміі разгарнуўшаеся ад Балтыкі да Венгрыі».

Падобныя «абразцы», як гаворыць работнікі васілевіцкай газеты, можна было-б множыць літаральна без канца.

* * *

У адной з заметак «Чырвонага барацьбіта» мы чытаем:

«Старшыня сельсовета павінен быць усебакова граматным». Добрая парада. Але ў першую чаргу яна датычыць работнікаў шклоўскай газеты. Бо, як гаворыць васілевіцкая газета ў адной заметцы, «**ёсць людзі, якім неабходна трэба...**».

Сапраўды ёсць людзі, якім і неабходна і трэба па-сур'ёзнаму ўзяцца за вучобу, каб рабіць культурную, сапраўды пісьменную газету.

ВЫСТАЎКА ПРАЕКТАЎ АДБУДОВЫ МІНСКА

Учора ў бібліятэцы імені Леніна адкрылася выстаўка конкурсных праектаў па забудове цэнтра горада Мінска, некаторых жылых кварталаў, рэканструкцыі парка імені Горкага, а таксама па адбудове Рудзенскага раёна.

Па адбудове цэнтра Мінска на конкурс прадстаўлена 11 праектаў. Аўтарамі іх з'яўляюцца выдатныя зодчыя Совецкага Саюза — акадэмікі В. Н. Сямёнаў і Н. Я. Колі, члены-карэспандэнты Акадэміі архітэктуры СССР І. Н. Собалеў, М. П. Парусніка ў і другія.

У ліку 11 конкурсных праектаў прадстаўлены тры праекты, над якімі працавалі беларускія аўтары — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, кіраўнік архітэктурна-планіровачнай майстэрні І. Г. Лангбард, галоўны архітэктар горада Мінска Ю. А. Егораў і архітэктар В. М. Маргуліс, архітэктары І. Н. Рудэнка і М. Н. Андросаў.

На выстаўцы грамадскасць Мінска зможа дакладна пазнаёміцца з усімі варыянтамі праектаў, якія красамоўна гавораць аб грандыёзным размаху будаўніцтва, якое будзе праводзіцца ў сталіцы Беларусі. Тут мінчане таксама ўбачаць праекты плошчаў, асобных будынкаў, помнікаў, жылых кварталаў горада, васьмікватэрных дамоў.

У аддзеле, прысвечаным адбудове Рудзенскага раёна, ёсць праекты ўсіх населеных пунктаў, макеты будынкаў сельсоветаў і г. д.

Выстаўка конкурсных праектаў будзе працаваць 10 дзён. Пасля шырокага прагляду грамадскасцю спецыяльнае журы адобрыць адзін з варыянтаў, паводле якога і будзе весціся адбудова.

—<>—

Па слядах неапублікаваных пісем

У рэдакцыю газеты «Звязда» звярнуўся са скаргай капітан Чырвонай Арміі Дзергачоў Л. І. Ён пісаў, што яго сястру Дзергачову Н. І., якая працавала загадчыкам гаспадаркі Аршанскага спецыяльнага дзіцячага дома, беспадстаўна знялі з работы. Дырэктар дома Ермашкевіч сістэматычна п'янствава ў, расцягваў прадукты, якія належалі дзецям. Калі Дзергачова адмовіла яму ў выдачы прадуктаў для папоек, Ермашкевіч беспадстаўна зняў яе з работы.

Пісьмо рэдакцыяй было накіравана на рэагаванне сакратару Аршанскага гаркома КП(б)Б тав. Пазнякову, які паведаміў, што пры праверцы факты, указаныя ў пісьме капітана Дзергачова, пацвердзіліся.

Ермашкевіч з работы дырэктара дзіцячага дома знят. Дзергачова Н. І. адноўлена на ранейшай рабоце.

АБЛАСНЫ АГЛЯД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

БРЭСТ. (Спец. кар. «Звязды»). У Брэсце гэтымі днямі закончыўся абласны агляд мастацкай самадзейнасці, на якім былі прадстаўлены самадзейныя калектывы і паасобныя выканаўцы дзевяці раёнаў і абласнога цэнтра.

Агляд пачаўся выступленнем зводнага хора, які выканаў дзяржаўны гімн Совецкага Саюза.

З вялікім поспехам выступіў на аглядзе калектыў мастацкай самадзейнасці Шэрашэўскага раёна. У яго рознастайнай праграме чаргаваліся мастацкае чытанне, сольныя выступленні спевакоў і выканаўцаў частушак. Драматычны гурток выступіў з цікавай пастаноўкай п'есы «Вечар у Петушках». Нядрэнна была выканана лялечная інсцэніроўка «Біты фрыц».

Вельмі цёпла быў сустрэт хор сялян Хорэўскага сельсовета, Пружанскага раёна, якім кіруе Феадосія Астапюк. Адразу-ж пасля выгнання нямецкіх акупантаў тав. Астапюк аднавіла хор і да абласнога агляду мастацкай самадзейнасці падрыхтавала цікавую і рознастайную праграму.

На аглядзе з поспехам выступіў гурток мастацкай самадзейнасці Косаўскага райпромкамбіната, які выканаў народныя песні, а таксама гурток мастацкай самадзейнасці абласных курсаў совецка-партыйных работнікаў. Удзельнікі гэтага гуртка, апранутыя ў яркія нацыянальныя касцюмы, добра выканалі рад беларускіх народных песень і танцаў, сярод якіх асаблівым поспехам карысталася «Лявоніха».

Вельмі рознастайнай была мастацкая самадзейнасць студэнтаў брэсцкага педагагічнага вучылішча. Тут былі і спевы, і мастацкае чытанне, і танцы. Заслужаным поспехам карысталіся пастаноўка скетча «Дзяўчына з характарам» і выканаўцы беларускага народнага танца «Крыжачок».

Журы конкурса прысудзіла другія прэміі з уручэннем грамат калектывам Шэрашэўскага раёна і Брэсцкага педвучылішча. Трэція прэміі атрымалі калектывы Бобрынскай і Бярозаўскай сярэдніх школ.

Лепшым выканаўцам і кіраўнікам самадзейных гурткоў прысуджаны індывідуальныя прэміі і граматы.

Восем лепшых калектываў і паасобныя выканаўцы абласці выдзелены на рэспубліканскі агляд мастацкай самадзейнасці.

Летні сезон беларускіх тэатраў

Тэатры рэспублікі рыхтуюцца да летняга сезона. У Мінск з Масквы прыязджае тэатр музыкальнай камедыі БССР. Ён пакажа аперэты «Гейша», «Тры сустрэчы», «Марыета». Тут-жа будзе гастраліраваць Дзяржаўны Беларускі тэатр імені Якуба Коласа, які знаходзіцца зараз у Віцебску.

У Гродна з Магілева прыедзе калектыў Дзяржаўнага рускага тэатра БССР. Гродненскім гледачам будуць паказаны спектаклі «Сустрэча ў цемнаце» драматурга Кнорэ, «Тры сястры» А. Чэхава і «Дванаццатая ноч» Шэкспіра. Пазней тут пабываюць Дзяржаўны Беларускі тэатр імені Якуба Коласа і маладзёжны тэатр, які камплектуецца ў Маскве. Палескі драматычны тэатр выедзе на гастролі ў Бабруйск і Пінск. У Магілеве і Мазыры будзе працаваць Беларускі тэатр лялек.

Канцэртныя брыгады артыстаў беларускіх тэатраў выедуць у раёны рэспублікі для абслугоўвання калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў у часе сяўбы.

(БЕЛТА).

ВЕСНАВАЯ ПУЦІНА Ў БЕЛАРУСІ

У рэспубліцы пачалася веснавая пуціна. Дзесяткі рыбалавецкіх брыгад выехалі на азёры і рэкі, якія ачысціліся ўжо ад лёду. Першымі выйшлі на веснавую пуціну рыбакі Пінскай абласці, якія вылавілі больш 200 пудоў рыбы.

Веснавы лоў рыбы пачаўся таксама ў іншых абласцях рэспублікі. На Браслаўскім і Асвейскім азёрах Полацкай абласці, дзе працуюць маладзёжна-комсамольскія брыгады, здабыта 380 пудоў буйнай рыбы.

Зараз рыбалавецкія брыгады Беларусі заканчваюць падрыхтоўку сетак і інвентару, каб шырэй разгарнуць веснавы лоў рыбы. Ужо падрыхтавана 107 невадаў, 1.800 стаўных сетак, 400 лодак і іншы інвентар.

ПАЧАЛІСЯ АДНАЎЛЕНЧЫЯ РАБОТЫ

МАГІЛЕЎ. (БЕЛТА). З наступленнем цёплых дзён у горадзе разгортваецца будаўніцтва. Штодзённа пасля работы на аднаўленне горада выходзяць сотні працоўных. Яны разбіраюць руіны, ачышчаюць цэглу, падрыхтоўваюць будаўнічыя пляцоўкі. У горад пачалі прыбываць першыя партыі рабочых-сезоннікаў.

Пачнецца аднаўленне двух школ, гасцініцы, радзільнага дома, кінатэатра і пяці вялікіх будынкаў з жылой плошчай у 10.000 квадратных метраў.

Соўнарком Беларускай ССР асігнаваў на аднаўленне Магілева ў гэтым годзе звыш двух мільёнаў рублёў.

ГАНДАЛЬ ЮВЕЛІРНЫМІ ВЫРАБАМІ

Рэспубліканская кантора Ювеліргандлю пачала сваю дзейнасць з верасня мінулага года. За гэты час адкрыты магазіны для гандлю ювелірнымі вырабамі ў Мінску, Бабруйску, Віцебску, Магілеве, Брэсце і Гродна. За мінулы год прадана гадзіннікаў, залатых, сярэбраных, металічных, камнерэзных вырабаў на 1.228 тысяч рублёў. За студзень і люты месяцы прадана гадзіннікаў на 168 тысяч рублёў, залатых вырабаў—на 158 тысяч рублёў, сярэбраных—на 239 тысяч рублёў, металічных—на 92 тысячы рублёў.

У бліжэйшы час адкрываюцца магазіны Ювеліргандлю ў Пінску і Баранавічах.

АДНАЎЛЕННЕ ЛЯЧЭБНЫХ УСТАНОЎ ГОРАДА

У гэтым будаўнічым сезоне Мінскі гарадскі аддзел аховы здароўя прыступае да аднаўлення Цэнтральнай паліклінікі і 2-х дзіцячых ясляў. Апрача таго, пры 3-й клінічнай бальніцы будзе пабудован прыёмны пакой.

На будаўніцтва асігнавана 1.550 тысяч рублёў.

ШКОЛЬНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ

У мінулым месяцы дырэкцыя «Саюздруку» адправіла для школ заходніх абласцей 100 бібліятэчак. У кожнай бібліятэчцы па 50—60 кніг. Сярод іх—«Вайна і мір» Талстога, кнігі Бальзака, Гладкова, Шолахава і другіх вядомых пісьменнікаў.

Совецкія танкі ў Германіі. Фотахроніка ТАСС.

Па Совецкаму Саюзу

СТУДЫЯ СТЭРЭАСКАПІЧНЫХ ФІЛЬМАЎ У МАСКВЕ

Першы совецкі поўнаметражны стэрэафільм „Рабінзон Крузо"

У Маскве створана першая ў СССР студыя мастацкіх стэрэаскапічных фільмаў. Дырэктарам і мастацкім кіраўніком яе назначан рэжысёр, аўтар першых эксперыментальных стэрэаскапічных карцін, А. Н. Андрыеўскі.

У студыі, апрача здымкаў, будзе вырабляцца стэрэаскапічная тэхніка, экраны, здымачная і праекцыйная апаратура. Пры студыі створана цэнтральная навукова-даследчая лабараторыя, якую ўзначаліць вынаходца стэрэакіно лаўрэат Сталінскай прэміі С. Іваноў.

У бліжэйшыя дні ў Тбілісі выязджае здымачная група, якая рыхтуе першы ў СССР поўнаметражны мастацкі стэрэафільм «Рабінзон Крузо» па аднайменнаму раману Даніэля Дэфо. Натурныя і павільённыя здымкі будуць рабіцца ў Тбілісі, Батумі і Сухумі. Прымяненне метада стэрэаздымкаў і стэрэапраекцыі дасць магчымасць гледачу бачыць малюнак нібы выходзячы за экран. Так, у часе бою з індыйцамі ўражанне будзе такое, быццам стрэлы праносяцца праз глядзельны зал. Над галовамі гледачоў праляцяць тысячы рознастайных экзатычных птушак, матылькоў.

(ТАСС).

АКАДЭМІЧНАЕ ВЫДАННЕ ТВОРАЎ В. Г. БЕЛІНСКАГА

Група ленінградскіх літаратуразнаўцаў прыступіла да падрыхтоўкі новага акадэмічнага выдання поўнага збору твораў і пісьмаў В. Г. Белінскага. Будзе выдана 12 тамоў, у якія ўвойдуць 150 артыкулаў і рэцэнзій вялікага класіка.

Поўны збор выйдзе з друку ў чэрвені 1948 года—да стагоддзя з дня смерці Белінскага.

(ТАСС).

ДЫСПЕТЧАРСКАЯ СЛУЖБА У МТС

У Андыжанскай машынна-трактарнай станцыі ўпершыню ва Узбекістане арганізавана дыспетчарская служба. Лепшыя спецыялісты станцыі вядуць круглясутачнае дзяжурства. Такое-ж дзяжурства ўведзена ва ўсіх 12 сельсоветах раёна. Дзяжурны сельсовета звязвае па тэлефону дыспетчараў МТС з брыгаднымі механікамі, інфармірує аб рабоце трактараў. У яго распараджэнні ёсць конь для выезду ў калгасы. Праз некалькі хвілін пасля аварыі трактара аб гэтым даведваецца зменны дыспетчар і неадкладна прымае захады.

(ТАСС).

СОРМАЎСКІЯ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРЫ-«МІЛЬЯНЕРЫ»

Па старэйшым рускім заводзе «Красное Сормово» звыш 2.500 рацыяналізатараў і вынаходцаў. Сярод іх пямала «мільянераў»—так сормаўшчыкі называюць тых рацыяналізатараў, прапановы якіх даюць эканоміі больш мільёна.

За чвэрць века рабочыя і вынаходны зберагліі заводу 97 мільёнаў рублёў. Больш двух трэцей гэтай сумы зэканомлена за гады Айчыннай вайны.

(ТАСС).

НАВУКОВАЯ СЕСІЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ КАЮМУ НАСЫРЫ

У Маскве адбылася навуковая сесія, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння найвыдатнага вучонага, асветніка і педагога татарскага народа Каюма Насыры.

Адкрываючы сесію, акадэмік С. П. Обнорскі ахарактарызаваў К. Насыры, як выдатнага вучонага і пісьменніка, палкага патрыёта Радзімы і баранцьбіта за збліжэнне татарскага і рускага народаў. На працягу больш чым поўвекавой сваёй навукова-педагагічнай і літаратурнай дзейнасці Насыры стварыў каля 40 твораў па матэматыцы, астраноміі, прыродазнаўству, геаграфіі, фальклору.

(ТАСС).

РЭКОРД КРЫВАРОЖСКАГА БУРШЧЫКА ІЛЬІ КУРЫЛА

Крыварожскі басейн абляцела вестка аб новым вытворчым рэкордзе на шахце імені Кірава. Буршчык Ілья Курыла, стаўшы на стаханаўскую вахту ў чэсць перамог наступаючай Чырвонай Арміі, прабурыў 32 забоі і прайшоў 32,2 пагонных метра, выканаўшы зменную норму на 5.040 процантаў.

За змену Курыла зарабіў 4.988 рублёў.

(ТАСС).

КУБАНСКІЯ КАЛГАСНІКІ РАЗМІНІРАВАЛІ ЗВЫШ 500 ТЫСЯЧ ГЕКТАРАЎ ЗЯМЛІ

Па кубанскай зямлі праходзіла нямецкая так званая «Блакітная лінія» абароны. Тысячы гектараў былі ўсюды замініраваны. Казакі-калгаснікі ўласнымі сіламі абследвалі і ачысцілі ад мін звыш 500 тысяч гектараў зямлі.

(ТАСС).

АДСТАЎКА ЯПОНСКАГА ЎРАДА

ТОКІО, 5 красавіка. (ТАСС). Агенцтва Домей Цусін перадае наступнае паведамленне японскага інфармацыйнага бюро: «Улічваючы сур'ёзнасць становішча, японскі кабінет міністраў прыняў рашэнне выйсці ў адстаўку, каб ачысціць шлях больш магутнаму ўраду. У адпаведнасці з гэтым рашэннем прэм'ер-міністр Койсо ўручыў сёння імператару заяву аб калектыўнай адстаўцы свайго кабінета.

ФАРМІРАВАННЕ ЯПОНСКАГА КАБІНЕТА ДАРУЧАНА АДМІРАЛУ СУДЗУКІ

ТОКІО, 5 красавіка (ТАСС). Як перадае агенцтва Домей Цусін, імператар даручыў адміралу Судзукі сфарміраваць новы кабінет.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 5 красавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што ў Галандыі, на поўначы ад Неймегена, войскі саюзнікаў дасягнулі ніжняга цячэння Рэйна на шырокім фронце. На поўначы ад канала Твентэ саюзнікі ачысцілі Хенгело. Яшчэ больш на поўнач бронетанкавыя часці, якія наступаюць з Нордхорна, выйшлі ў некалькіх пунктах да ракі Эмс. Оснабрук занят саюзнікамі, але яшчэ поўнасцю не ачышчан ад немцаў. У Мюнстэры саюзнікі захапілі звыш 1.700 палонных.

На паўночным канцы Рурскага «мяшка» пяхотныя часці саюзнікаў фарсіравалі Дортмунд-Эмскі канал і прасунуліся да пункта, які знаходзіцца ў 2,5 кілометра на захадзе ад Люнена. На ўсходнім канцы Рурскага «мяшка» танкі саюзнікаў дасягнулі Гільдфельда і Грэнебаха.

Войскі саюзнікаў дасягнулі ракі Везер паблізу Бад-Эйнхаузена. Другія часці саюзнікаў дасягнулі ракі Вега ў раёне Вегі і захапілі 4 тыс. палонных. Колькасць ачышчан ад праціўніка.

Танкавыя часці саюзнікаў дасягнулі прадмесцяў Обердорла, у чатырох кілометрах на поўдні ад Мюльхаузена. Пяхотныя часці саюзнікаў, якія фарсіравалі раку Эмс, дасягнулі пункта, які знаходзіцца ў 22,5 кілометра на паўночным захадзе ад Эйзенаха, перадавыя бронетанкавыя часці ачысцілі горад Гота і ўступілі ў Ордруф.

Ачышчан ад праціўніка рад населеных пунктаў на паўднёвым захадзе ад Эйзенаха. Як паведамляюць, немцы страцілі 4 тысячы чалавек у часе баёў за Ашафенбург.

У паведамленні штаба адзначаецца сама прасоўванне ў раёне Вюрцбурга, Швайнфурта і Гейльброна.

На працягу 3 красавіка саюзнікі захапілі 28.817 палонных.

Заява Стэтыніуса на прэс-канферэнцыі

НЬЮ-ЙОРК, 3-га красавіка. (ТАСС). Дзяржаўны сакратар ЗША Стэтыніус заявіў на прэс-канферэнцыі ў Вашынгтоне, што прэзідэнт Рузвельт рашыў не патрабаваць для Злучаных Штатаў трох галасоў у Асамблеі праектыруемай Міжнароднай арганізацыі. Аднак, сказаў Стэтыніус, гэтае рашэнне ніякім чынам не змяняе абяцання Рузвельта, данага ім у Крыму, падтрымаць патрабаванне Совецкага Саюза аб прадастаўленні месц у Асамблеі Украіне і Беларусі. Стэтыніус таксама абвергнуў чуткі, што канферэнцыя ў Сан-Францыска, назначаная на 25 красавіка, магчыма, будзе адкладзена. «Урад Злучаных Штатаў, — сказаў Стэтыніус, — лічыць, што хуткі тэмп развіцця ваенных і палітычных падзей зусім не патрабуе адтэрміноўкі канферэнцыі ў Сан-Францыска па пытанню аб Міжнароднай арганізацыі, а, наадварот, робіць усё больш неабходным, каб планы, якія датычаць гэтай канферэнцыі, а таксама арганізацыі, намечанай у Думбартон-Оксе, былі хутка ажыццёўлены. Апрача таго, мы не атрымалі ніякага ўказання на тое, што які-небудзь урад лічыць, што гэта канферэнцыя павінна быць адкладзена». У заяве Стэтыніуса гаворыцца, што «Совецкія прадстаўнікі ў Ялце прапанавалі, каб Беларуская і Украінская рэспублікі былі першапачатковымі членамі прапануемай Міжнароднай арганізацыі. Гэтае пытанне павінны абмеркаваць і вырашыць Аб'еднаныя Нацыі, якія збяруцца ў Сан-Францыска. Улічваючы важнасць, якую Совецкі Урад надаваў гэтай прапанове, амерыканскія прадстаўнікі ў Ялце, поўныя найглыбейшай павагі да гераічнай ролі, адыгранай насельніцтвам гэтых рэспублік у яго непахісным супраціўленні агульнаму ворагу, і да стойкасці, з якой яно вынесла вялікія пакуты ў часе вайны, згадзіліся, каб урад Злучаных Штатаў падтрымаў такога роду совецкую прапанову ў Сан-Францыска, у выпадку, калі яна будзе зроблена. Аднак у Ялце не было заключана ніякага пагаднення па пытанню аб удзеле гэтых рэспублік у канферэнцыі ў Сан-Францыска. У гэтым акалічнасцях амерыканскія прадстаўнікі ў Ялце меркавалі, што іх абавязкам ляецца рэзервіраваць магчымасць таго, каб Злучаныя Штаты мелі тры галасы ў Генеральнай Асамблеі. Совецкія і англійскі прадстаўнікі выказалі сваю гатоўнасць падтрымаць гэтую прапанову ў выпадку калі Злучаныя Штаты гэта зробяць, — даставіць Злучаным Штатам тры галасы ў Асамблеі. Прэзідэнт рашыў, што на канферэнцыі ў Сан-Францыска Злучаныя Штаты не будуць патрабаваць дадатковых галасоў у генеральнай Асамблеі для ўсіх Злучаных Штатаў».

Адказваючы на пытанне, як будзе на канферэнцыі ў Сан-Францыска рашаць, ці павінны Украіна і Беларусь стаць членамі Сусветнай арганізацыі, Стэтыніус сказаў, што канферэнцыя будзе рашаць больш галасоў. Паводле яго слоў, Злучаныя Штаты падтрымліваюць прапанову Совецкага Саюза аб членстве Украіны і Беларусі. Пытанне аб тым, ці абмяркоўваюцца зараз якія-небудзь прапановы аб допуску Украіны і Беларусі на канферэнцыю ў Сан-Францыска, Стэтыніус адказаў адмоўна.

У адказ на пытанне карэспандэнта аб поваду падтрымання Совецкім Саюзам прапановы аб допуску на канферэнцыю Польскага Часовага Урада Стэтыніус цытыраваў апублікаваную на мінулым тыдні заяву дзяржаўнага дэпартамента. Ён сказаў, што перагаворы з поваду стварэння Польскага Часовага Урада на дэмакратычнай аснове прадаўжаюцца. Паводле слоў Стэтыніуса, ён настроен аптымістычна адносна іх выніку.

Адказваючы на пытанне аб тым, ці згадзіўся Рузвельт за апошні час са Сталіным і Чэрчылем з поваду прапановы Совецкага Саюза аб месцах у Асамблеі для Беларусі і Украіны, Стэтыніус сказаў, што, як ён думае, гэтыя тры дзеячы пастаянна падтрымліваюць кантакт паміж сабой.

НАЛЁТ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ НА ГЕРМАНІЮ

ЛОНДАН, 5 красавіка. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што ў ноч на 5 красавіка вельмі буйныя злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Германію. Галоўнымі аб'ектамі бамбардыроўкі з'явіліся заводы сінтэтычнага гумачага ў Мерзебургу і Гамбургу.

Самалёты «Маскіта» зрабілі налёт на Берлін.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ ЗАНЯЦЦЯ САЮЗНІКАМІ ОСНАБРУКА

ЛОНДАН, 5 красавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што буйны германскі чыгуначны цэнтр Оснабрук быў занят без асаблівага супраціўлення з боку немцаў. 11-я англійская танкавая дывізія абыйшла горад да вечара 3 красавіка.

Немцы настолькі дэзарганізаваны і знаходзяцца ў такім замяшанні, што не маюць ніякага ўяўлення, дзе пачынаецца і дзе канчаецца фронт. Часам здараецца, што яны прадпрымаюць невялікія атакі супраць тылавых пазіцый саюзнікаў, мяркуючы, што гэта перадавая лінія, тады як на самой справе фронт знаходзіцца на адлегласці 50 міль ад пункта, дзе прадпрымаецца атака.

Адказны рэдактар
В. САМУЦІН.

У тэатрах і кіно:

Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета

У памяшканні Дома Чырвонай Арміі 7 красавіка

«МАДАМ БЕТЭРФЛЕЙ»
(Чыо-Чыо-Сан)
Пачатак у 19 гадзін 30 мінут.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

9 красавіка ПРЭМ'ЕРА
«ВЕЧАР КАМЕДЫІ»
(«Паўлінка», «Прымакі»)
народнага паэта БССР Янкі Купалы
Пачатак у 19 гадз. 30 мінут.

Кінотэатр «Першы» «НАШЭСЦЕ»
Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16, 18, 20, 22 гадз.

Кінотэатр «Беларусь» «ЭДЫСОН»
Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16, 18, 20, 22 гадз.

Кінотэатр «Радзіма» «МАЯ ЛЮБОЎ»
Пачатак сеансаў у 20 і 22 гадзіны.

Дзіцячы кінотэатр «ПАДКІДЫШ»
Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16 і 18 гадз.

Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі вялікай Айчыннай вайны тэрмінова патрабуюцца

фатографы для работы па дагаворах як у Мінску, так і ў іншых гарадах і раёнах БССР. ЗВЯРТАЦЦА: Мінск, плошча Свабоды, 41.

Дырэкцыя.

Аўтарамонтнай майстэрні АТО НКГБ БССР ПАТРАБУЮЦЦА

на сталую работу ў г. Мінску:

аўтаінжынер, аўтатэхнік, сакратар-машыністка, бухгалтар, касір-рахункавод, агент па снабжэнню, дыспетчар гаража, аўтаслесары, фрэзероўшчык, токар, каваль, балатабоец, слесары, маляры, абойшчыкі, аўтаэлектрыкі, акумулятаршчык, газа-электразваршчык, радыятаршчык, запраўшчыкі машын, вулканізатар, падсобныя рабочыя і вучні.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: вул. Валадарскага, 6, тэл. № 2-75. Начальнік майстэрні.

Беларускаму трэсту „Галоўмука" ПАТРАБУЮЦЦА

на сталую работу ў трэсце і на перыферыі наступныя спецыялісты:

галоўныя і старшыя бухгалтары, планавікі-эканамісты, сакратар, інжынеры-будаўнікі, тэхнікі-будаўнікі, інжынеры і тэхнікі-мукамолы, інспектар па чыгуначных перавозках, лабаранты па мукамольнай справе, дыспетчар, машыністка, цесляры, сталяры, бляхары, слесары, токары, каменшчыкі, электраманцёры, штукатуры, маляры і млынавыя рабочыя-мукамолы.

З ПРАПАНОВАМІ ЗВЯРТАЦЦА: Абуткова, 71, Белтрэст «Галоўмука», з 9 да 12 гадзін.

Мінскаму абласному спецгандлю ПАТРАБУЮЦЦА:

чорнарабочыя на падсобныя гаспадаркі, якія размешчаны за горадам, майстры, краўцы, шаўцы і вартаўнікі.

Рабочыя забяспечваюцца харчаваннем і неабходнай вопраткай і абуткам.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: Інтэрнацыянальная, 10, з 9 да 13 гадзін. Тэл. камутатар НКВД № 38.

З 5 ПА 15 КРАСАВІКА У ПАМЯШКАННІ БІБЛІЯТЭКІ ІМЕНІ ЛЕНІНА (Чырвонаармейская вул.)

адкрыта выстаўка конкурсных праектаў

ЗАБУДОВЫ ЦЭНТРА ГОРАДА МІНСКА І ПЛАНІРОЎКІ ПАСЕЛІШЧАЎ КАЛГАСАЎ РУДЗЕНСКАГА РАЁНА.

Выстаўка адкрыта з 12 да 19 гадзін.

УВАХОД СВАБОДНЫ.

МІНСКАЕ
абласное ўпраўленне дзяржпрацашчадкас і дзяржкрэдыта
на падставе ўказання Народнага Камісарыята Фінансаў БССР

8 красавіка ў 12 гадзін дня ў гор. Мінску у памяшканні кінотэатра „Радзіма" (Рэволюцыйная вул.)

ПРАВОДЗІЦЬ аб'еднаны тыраж па выйгрышных укладах.

У тыражы ўдзельнічаюць укладчыкі, у якіх ёсць ліцавыя рахункі па выйгрышных укладах у ашчадных касах Мінскай, Віцебскай, Брэсцкай, Гродненскай, Баранавіцкай, Маладзечненскай і Полацкай абласцей.

УКЛАДЧЫКІ, ЯКІЯ МАЮЦЬ НА ЗАХОЎВАННІ У АШЧАДНЫХ КАСАХ ВЫЙГРЫШНЫЯ ЎКЛАДЫ, КАРЫСТАЮЦЦА ЎСІМІ ПРАВАМІ, ПРАДАСТАЎЛЕНЫМІ ЎКЛАДЧЫКАМ АШЧАДНЫХ КАС, як-та:

СВАБОДНА РАСПАРАДЖАЦЦА СВАІМ УКЛАДАМ, ЗАХОЎВАННЕ УКЛАДАЎ У АШЧАДНЫХ КАСАХ НЕ АБМЯЖОЎВАЕЦЦА НІЯКІМІ ГЭРМІНАМІ.

ЦЭЛАСЦЬ УКЛАДАЎ, УНЕСЕНЫХ У АШЧАДНЫЯ КАСЫ, ГАРАНТЫРУЕЦЦА УРАДАМ САЮЗА ССР.

АШЧАДНЫЯ КАСЫ ЗАХОЎВАЮЦЬ ТАЙНУ УКЛАДАЎ.

Даходы па выйгрышных укладах выплачваюцца ў форме выйгрышаў.

У кожным тыражы па 1.000 нумароў рахункаў (укладаў) па выйгрышных укладах падае 25 выйгрышаў, у тым ліку адзін выйгрыш у размеры дзвесце процантаў сярэдняга астатка ўклада за прайшоўшае паўгоддзе; два выйгрышы у размеры ста процантаў сярэдняга астатка ўклада і дваццаць два выйгрышы кожны ў размеры пяцьдзесят процантаў сярэдняга астатка ўклада за прайшоўшае паўгоддзе.

Уносьце вашы зберажэнні ў ашчадныя касы на выйгрышныя ўклады!

Мінскае абласное ўпраўленне дзяржпрацашчадкас і дзяржкрэдыта.

Рашэнне № 100
выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

12 САКАВІКА 1945 г. г. МІНСК

Аб зацверджанні правіл правядзення земляных работ у горадзе Мінску

1. Правілы правядзення земляных работ у гор. Мінску — зацвердзіць (ПРЫКЛАДАЮЦЦА)

2. Асобы, віноўныя ў нарушэнні правіл правядзення земляных работ, падвяргаюцца штрафу ў размеры 100 рублёў або прымусовым работам да 14 дзён.

3. Кантроль за выкананнем гэтага рашэння ўскласці на органы міліцыі і мінгоркомгас.

Гэтае рашэнне ўваходзіць у сілу з дня яго апублікавання ў друку.

Старшыня выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных К. БУДАРЫН.

Сакратар выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных О. ГАЙДУК.

ПРАВІЛЫ правядзення земляных работ у горадзе Мінску

1. Правядзенне земляных работ, звязаных з раскопкамі вуліц, тратуараў і плошчаў без адпаведнага дазволу аддзела добрабыту гор. Мінска забараняецца.

2. Для атрымання дазволу на раскопку неабходна:

а) прадставіць у аддзел добрабыту Мінгоркомгаса заяўку у двух экземплярах, узгодненую з бюро інвентарызацыі і гарадскім архітэктарам.

б) Аплаціць кошт аднаўлення разбуранага раскопкай дарожнага пакрыцця, згодна калькуляцыі, зацверджанай Мінгоркомга сам.

3. Выданы дазвол на правядзенне работ павінен знаходзіцца ў работніка на месцы работ.

4. Да пачатку работ месца раскопкі павінна быць агароджана ўстанаўленнем сігналаў на адлегласці 5 — 10 метраў ад месца работы.

5. Пры правядзенні земляных работ будматэрыялы—пясок, камень, брусчатка, клінкер і асфальт не павінны змешвацца і павінны быць складзены ў штабялі, згодна гатунку. Выкінутая з траншэі зямля павінна быць укладзена з такім разлікам, каб не перашкаджала руху транспарта і пешаходаў.

6. Пры папярэчных раскопках вуліц работы праводзіць па частках, каб не закрываць вуліцу для руху транспарта. Пры прадольных раскопках павінны быць забяспечаны пад'езды да магазінаў і да іншых будынкаў.

7. Пасля заканчэння ўсіх падземных работ робіцца засыпка траншэй пластамі ў 20 сантыметраў з паследуючай утрамбоўкай, паліўкай вадой, і ўборка месца работ.

8. Забараняецца распрацоўка кар'ераў па здабычы пяску, гравія і гліны ў межах горада Мінска без дазволу сектара добрабыту.

АТ28710 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск. вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149. Адказнага сакратара—150.